

САКРЭТЫ ШЧАСЦЯ СПЯВАЧКІ ВЛАДЫ

Сямейная газета

КАЛІ ДЗІЦЯ «ЖЫВЕ» Ў МАБІЛЬНІКУ



Сямейная газета


Выдаецца з 9 чэрвеня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 ЛІСТАПАДА 2020 г. ЧАЦВЕР № 226 (29340)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Станіслаў ЗАСЬ, генеральны сакратар АДКБ:**

*«Выкліканыя пандэміяй праблемы, якія паўплывалі на зніжэнне ўзроўню міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы бяспекі, у канчатковым выніку адбіліся на эфектыўнасці мер па супрацьдзеянні сучасным выклікам і пагрозам, у тым ліку тэрарызму. Пагаршэнне ў эканамічнай сферы і зніжэнне ўзроўню жыцця мільёнаў людзей па ўсёй планеце з прычыны каранцінных мер стварае дадатковыя магчымасці для вярбоўкі новых рэкрутаў, выкарыстоўваючы пры гэтым розныя сучасныя інфармацыйна-камунікацыйныя тэхналогіі».*

# Аматар яблыкаў Міша





Галоўны персанаж вальеры з дзікімі жывёламі Нацыянальнага парку «Браслаўскія азёры», на якога адмыслова едуць паглядзець, — буры мядзведзь. Ён жыве ў вялізнай «двухпакаёвай» клетцы, работнікі вальеры яго добра дагледжаюць, сыта кормяць, і Міша — мянушка касалапага — выглядае вельмі прыгожа, статна. Сёлета Мішу споўнілася дваццаць тры гады.

А я прыгадваю, калі ўпершыню ўбачыў гэтага мядзведзіка — ён гуляў па браслаўскай вёсцы Каленкішкі са сваім гаспадаром — егерам Чэславам ПЕТКУНОМ. У той час Мішу было толькі год з невялікім. Пакуль рыхтавалі вальеру, Міша кватараваў спачатку ў доме гаспадара, а потым, калі падрос, — у цёплым хлеўчыку, за сцяной якога рохкалі парсючкі. Чэслаў часта выгульваў свайго гадаванца, знаёміў з ім вяскоўцаў, а тыя яго частавалі ласункамі. Мне пашчасціла ўбачыць гэты шпацыр незвычайных сяброў. І ў «Звяздзе» з'явіўся фотаздымак пад назвай «Міша шукае Машу».

Але Міша так і не знайшоў сабе пару і дагэтуль халасцякуе. Па-ранейшаму любіць прысмакі, асабліва яблыкі. Як толькі ўбачыць іх, сядае на «пятую кропку», альбо падымаецца на задніх лапах і разяўляе пашчу — маўляў, лаўлю вашы яблыкі. Работнік вальеры і сафары-парку Аляксандр ПАНЬКО (*на фота*) таксама даглядае мядзведзя і ведае яго звычкі. Сёлета ўраджай на яблыкі багаты, і Міша не мае недахопу ў вітамінных ласунках.

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## КОРАТКА

• Базавая стаўка ў Беларусі з 1 студзеня 2021 года вырасце да Br195.

• **Больш за восем тон рыбы выпусцілі ў азёры Віцебскай вобласці.**

• Асноўным пакупніком беларускай бульбы ў студзені — верасні была Украіна, агародніны — Расія.

• **У Мінску аднавілі Кальварыйскую вежу. Яна знаходзіцца ў культурна-дзелавым квартале «К-21» каля станцыі метро «Маладзёжная». Пры рэканструкцыі выкарыстоўвалі арыгінальную цэглу пасляваеннай вытворчасці.**




ISSN 1990 - 763X


На слыху

**Уладзімір КАРАНІК:**

## «Абмежаванне кантактаў нават на 25 % зніжае нагрузку на медыкаў напалову»

**Калі Гродзенская вобласць выйдзе на плато па захворванні, чым другая хваля адрозніваецца ад першай, якія меры прымаюцца ў рэгіёне па мінімізацыі рызыкі распаўсюджвання інфекцыі COVID-19, ці абавязковы масачны рэжым — на гэтыя і іншыя пытанні адказаў старшыня Гродзенскага абласнога выканаўчага камітэта, а ў недалёкім мінулым — міністр аховы здароўя краіны Уладзімір КАРАНІК.**



Фота БелТА.

Паводле яго слоў, Гродзенская і Магілёўская вобласці апошнія ўвайшлі ў пад'ём захваральнасці на каранавірусную інфекцыю падчас першай хвалі і спыніліся на больш нізкіх паказчыках. Між тым, тут падчас другой хвалі пад'ём захваральнасці быў больш ранні і значны. У рэгіёне раней за ўсё пачалі рэгістраваць рост колькасці выпадкаў каранавіруснай інфекцыі.


СТАР. 2


Жыллё

## ПРАЦЯГЛАЕ ПАДЗЕННЕ «КВАДРАТА»

### Адмоўная дынаміка цэн назіраецца на другасным рынку жылля беларускай сталіцы на працягу больш чым трох месяцаў

**Зніжэнне цэн на другасным рынку нашай краіны працягваецца. За апошні тыдзень індэкс цэн рынку жылля Мінска знізіўся на 0,7 % і склаў 1345 долараў за квадратны метр. Сярэдняя цана кватэр у новабудоўлях сталіцы за апошні тыдзень не змянілася і складае на гэты момант 1311 долараў за «квадрат». Разрыў паміж сярэднім узроўнем цэн першаснага і другаснага рынкаў склаў 36 долараў за квадратны метр, што з'яўляецца мінімальным значэннем за апошнія два гады.**

На думку **дырэктара агенцтва нерухомасці «БелЦТН» і ганаровага старшыні ГА «Беларуская асацыяцыя «Нерухомасць» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА,** на другасным рынку жылля цяпер адзначаецца глабальная нявызначанасць. Здавалася б, зараз назіраецца мінімальны попыт на фоне максімальнай прапановы, але цэны на аб'екты нерухомасці імкліва не падаюць. Яны хутчэй павольна паўзуць уніз, лічыць наш эксперт. Справа ў тым, што, на думку спадара Прасталупава, больш актыўнаму падзенню цэн перашкаджае абмежаваны аб'ём будаўніцтва новага жылля. Практычна ўсе ліквідныя аб'екты жыллёвага будаўніцтва выкупляюцца ўжо на стадыі «катлавана». Нават тое жыллё, якое будуецца па павышаным цэнніку ў знакавых пунктах Мінска, усё роўна знойдзе сваіх пакупнікоў, таму што канкурэнцыі сярод сталічных будаўнікоў няма.


СТАР. 3

# «Абмежаванне кантактаў нават на 25 % зніжае нагрузку на медыкаў напалову»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Зараз ідзе ўжо трэці тыдзень, і сітуацыя з паступленнем пацыентаў з пнеўманіямі (а гэта найбольш складаная катэгорыя пацыентаў) стабілізавалася. І гэта сведчыць аб тым, што тэмпы росту захваральнасці зніжаюцца. Калі такая тэндэнцыя захаваецца, можна будзе сказаць, што Гродзенская вобласць выйшла на плато па захваральнасці на пнеўманію, выкліканую каранавірусам.

— Трэба максімальна скараціць наведванне масавых мерапрыемстваў і абмежаваць асабістыя кантакты. Заўважана, што абмежаванне кожным з нас кантактаў нават на 25 % скарачае нагрузку на медыкаў напалову, — падкрэсліў Уладзімір Каранік. — Трэба адзначыць, што самая вялікая колькасць неабавязковых кантактаў назіраецца ў Мінску. І ў выніку палова ўсіх выпадкаў захворвання рэгіструецца ў сталіцы. Гэта расплата за ігнараванне элементарных мер уласнай бяспекі.

Губернатар адзначыў, што рэальная колькасць інфіцыраваных вышэйшая, чым гэта выяўляецца тэстамі. Бо на цяперашні момант ёсць бессімптомныя, скрытыя формы, таму колькасць рэальна інфіцыраваных і выяўленых — гэта розныя лічбы. Прагнозы заснаваныя на колькасці станоўчых тэстаў, але тут ёсць і паўторныя тэсты, і кантрольныя. Стабільнасць сітуацыі, адзначыў губернатар, ацэньваецца нават не паводле колькасці выяўленых станоўчых вынікаў, а колькасцю складаных форм — пнеўманіямі. Менавіта па гэтых фактарах можна рабіць выснову аб развіцці сітуацыі з каранавірусам. Калі колькасць пнеўманій стабільная, значыць, працэс інфіцыравання стабілізаваўся.

У рэгіёне вядзецца вельмі дакладны аналіз эпідэмічнай сітуацыі. Напрыклад, цяпер заўважана, што большую частку ў структуры захваральнасці ў сувязі з рэспіраторнымі і віруснымі інфекцыямі складаюць дарослыя, хоць у звычайныя гады сезонныя інфекцыі больш уплываюць на дзяцей. Калі сярод хворых колькасць дарослых зніжаецца, гэта значыць, сітуацыя наближаецца да сезоннай.

— Мы тры тыдні назіраем стабілізацыю рэспіраторных інфекцый, хоць былі тыдні, калі рост перавышаў 30 %. Таксама стабілізуецца колькасць пнеўманій — рост быў 70 % на тыдзень. І мы бачым, што доля дарослых зніжаецца, — удакладніў Уладзімір Каранік.

Калі параўноўваць першую і другую хвалі, цяпер працэс аказання дапамогі ўжо наладжаны. Не даводзіцца траціць час на арганізацыю вытворчасці сродкаў аховы, новых каналаў паставак медпрэпаратаў. На першым этапе з гэтым былі сур'ёзныя праблемы. За гэты час была мадэрнізавана сістэма аховы здароўя, закуплена абсталяванне, у тым ліку дыягнастычнае. Павялічаны запасы сродкаў аховы і медыкаментаў. Да таго ж з'явіўся і больш вопыт па аказанні медыцынскай дапамогі «ковідным» пацыентам.

— У другую хвалю мы больш выкарыстоўваем ложкаў, чым у першую. І гэта менш за палову ўсяго ложкавага фонду. Калі глядзець па апаратах штучнай вентыляцыі лёгкіх, задзейнічана крыху больш за 10 % такога абсталявання. Функцыянуе пяць лабараторый па тэсціраванні метадам ПЛР, тры з іх у Гродне і па адной у Лідскай і Астравецкай ЦРБ. Магчыма, будзе задзейнічана і лабараторыя медыцынскага ўніверсітэта. Плануецца адкрыццё ПЛР-лабараторыі ў Ваўкавыску, — паведаміў гродзенскі губернатар.

Уладзімір Каранік не абышоў і пытанне паводзін саміх грамадзян. Калі ў першую хвалю прысутнічаў страх, зараз многія расслабіліся, не захоўваюць дыстанцыю, меры бяспекі. Таму прынята пастанова ўвесці ва ўсіх раёнах і Гродне абавязковы масачны рэжым. І гэта дзейнічае. Трэба разумець, што маска — гэта, у першую чаргу, засцярога ад знешняга ўздзеяння. Асабліва тых, хто не мае сімптомаў, але можа заразіць.

— Хоць сістэма аховы здароўя працуе ў поўным аб'еме, разам з тым кожнаму трэба паклапаціцца аб сваім здароўі, — лічыць суразмоўнік. — Бо толькі сумеснымі намаганнямі можна змяніць сітуацыю і выйсці на яе паляпшэнне з захворваннем. На сённяшні дзень назіраецца яшчэ і сезонны пад'ём.

Па словах Уладзіміра Караніка, вакцыны, якая цалкам прайшла б клінічныя выпрабаванні, пакуль няма. Ёсць некалькі вакцын, што праходзяць трэцюю фазу клінічных выпрабаванняў. Для таго каб сказаць, што такая вакцына з'явілася, трэба пераканацца, што яна бяспечная. Але калі ўлічваць, колькі ўвагі надаецца гэтаму пытанню, магчыма, адказ на яго будзе атрыманы на працягу года або паўтара. Увогуле, спецыялісты лічаць, што вірус з цягам часу нікуды не дзенецца, а проста будзе страчваць пандэмічныя ўласцівасці і ператворыцца ў сезонны. Гаворачы пра тое, калі скончыцца пандэмія, Уладзімір Каранік называе вясну 2021 года.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# УРАЧЫ ЗАКЛІКАЮЦЬ НАДЗЕЦЬ МАСКІ

**Апараты ШВЛ, кіслародныя пункты, чэргі на вуліцах, ПЛР-дыягностыка — усе гэтыя і іншыя пытанні агучваліся падчас нарады ў Магілёўскім аблвыканкаме па прафілактыцы каранавіруснай інфекцыі.**

Магілёўская вобласць першая ў краіне аб'явіла масачны рэжым, і гэта, на думку спецыялістаў, дапамагло запаволіць працэс распаўсюджвання небяспечнай хваробы.

Як распаўсюджваецца каранавірусная інфекцыя і якая дапамога патрэбна яшчэ з боку дзяржавы, гэтыя пытанні цікавілі ў першую чаргу **старшыню аблвыканкама Леаніда ЗАЙЦА.** Ён стаў ініцыятарам правядзення нарады, каб пачуць з першых вуснаў, ці ёсць праблемныя пытанні, якія трэба вырашаць неадкладна.

**Начальнік галоўнага ўпраўлення па ахове здароўя Магілёўскага аблвыканкама Аляксандр СТАРАВОЙТАЎ** адзначыў, што сітуацыя па захваральнасці на COVID-19 у вобласці сур'ёзная, але кантралюемая. Пад назіраннем медыкаў на 18 лістапада знаходзілася 18 тысяч «ковідных» пацыентаў і кантактных асоб, 22 тысячы ўжо паправіліся. Асноўная нагрузка лягла на паліклінікі, на ўліку якіх у чатыры разы болей пацыентаў, чым у стацыянарах. Усе паліклінікі падзелены на «чырвоную» зону, дзе прымаюць пацыентаў з тэмпературай і яўнымі прыкметамі інфекцыі, і «зялёную» — чыстую. У вобласці створана 146 кантактных груп, якія выязджаюць да пацыентаў на дом для агляду іх на прадмет захворвання на COVID-19. Аляксандр Старавойтаў звярнуў увагу, што ў Магілёве і Бабруйску, а таксама Асіповічах, Быхаве і Мсціславе не хапае медыцынскіх аўтамабіляў, і губернатар даў распараджэнне вырашыць пытанне ў гэты ж дзень.

Леанід Заяц таксама даручыў павялічыць колькасць тэлефонных ліній для кансультацый пацыентаў дома, каб не ўзнікала праблем з дазвонам у медыцынскія ўстановы.

**Памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід МАРТЫНЮК** звярнуў увагу на тое, што паступаюць скаргі на чэргі ў паліклініках — людзі стаяць нават на вуліцах. Аляксандр Старавойтаў пацвердзіў, што такія выпадкі былі, і для іх прадухілення ў паліклініках максімальна пашырылі «чырвоныя» зоны.

У бальніцах вобласці пад пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй на 18 лістапада адводзілася 3895 ложкаў (37 % ад агульнай колькасці), у іх лячэнні задзейнічана 4820 урачоў. У якасці дадатковай сілы — работа рэгістратарамі і гэтак далей — з 17 лістапада ў вобласці прыцягнуты 236 навучэнцаў медыцынскіх каледжаў. На ўзбраенні ўстаноў аховы здароўя знаходзіцца 273 апараты ШВЛ, маецца 1686 кіслародных пунктаў, некалькі дзясяткаў кіслародных канцэнтратараў.

На момант правядзення нарады ў Магілёўскай вобласці адзначалася 500 ачагоў каранавіруснай інфекцыі, амаль палова з якіх ва ўстановах адукацыі. Пра гэта паведаміла **галоўны ўрач Магілёўскага абласнога цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Святлана НЯЧАЙ.** На ўзбраенні санслужбы знаходзіцца дзесяць комплексаў ПЛР, з дапамогай якіх праводзіцца даследаванне на «ковід». Кадраў, як запэўніла Святлана Нячай, хапае, а вось магутнасцяў не вельмі. Неабходна некалькі падобных комплексаў і аргтэхніка для аператыўнай перадачы інфармацыі ва ўстановы аховы здароўя. Размова таксама ішла пра неабходнасць закупкі дадатковых дэзынфекцыйных камер для бальніц Магілёва і Бабруйска, дзе лечацца «ковідныя» пацыенты.

Асноўная колькасць пацыентаў з каранавіруснай інфекцыяй знаходзіцца ў Магілёўскай бальніцы № 1, там пад іх выдзелена 550 ложкаў. І, як запэўніў **галоўны ўрач гэтай установы Віктар КЛАЧКОЎ,** ёсць магчымасць павялічыць іх колькасць яшчэ на 40.

— Пацыентаў у гэтую хвалю сапраўды стала больш, — адзначыў ён. — Калі раней мы прымалі на камп'ютарную тамаграфію 80—90 чалавек, то цяпер 130—140. У параўнанні з першай хваляй мы павялічылі колькасць кіслародных пунктаў са 120 да 160—170. Установа тым не менш працуе ў штатным рэжыме. Сёння мы цалкам забяспечаны сродкамі індывідуальнай аховы, лекавымі сродкамі, вырабамі медыцынскага прызначэння. Большасць пацыентаў папраўляецца, хоць ёсць і лятальныя выпадкі. Гэта, як правіла, людзі з павышанай вагой і спадарожнымі захворваннямі, такімі, як гіпертанія, цукровы дыябет, захворванні сэрца і іншыя. Да групы рызыкі адносяцца і людзі ва ўзросце. Таму мы заўсёды нагадваем, што трэба насіць маскі і прытрымлівацца сацыяльнай дыстанцыі.

Віктар Клачкоў таксама паведаміў, што з улікам новых выпрабаванняў, што сёння існуюць, ёсць неабходнасць у будаўніцтве на тэрыторыі бальніцы № 1, якая з'яўляецца шматпрофільнай, яшчэ і інфекцыйнай бальніцы. Нават праект ужо амаль гатовы. Леанід Заяц паабяцаў, што ў наступным годзе такі аб'ект абавязкова з'явіцца. Трэба будзе толькі вызначыцца, наколькі апраўдана будаваць яго побач са звычайнай бальніцай. Ён таксама звярнуў увагу на тое, што налета плануецца істотнае ўзмацненне матэрыяльнай базы вобласці і будаўніцтва шэрагу аб'ектаў. Казаць смела пра такія планы дазваляе тое, што вобласць сёлета забяспечыла рост асноўных сацыяльна-эканамічных паказчыкаў.

**Прафесар кафедры інфекцыйных хвароб Беларускага дзяржаўнага медуніверсітэта Дзмітрый ДАНІЛАЎ** і **дацэнт кафедры анестэзіялогіі і рэаніматалогіі Беларускай медыцынскай акадэміі паслядыпломнай адукацыі Уладзіслаў РЫМАШЭЎСКІ,** задача якіх дапамагаць калегам арганізаваць лячэнне з улікам передавых тэхналогій і падыходаў, паназіралі, як арганізавана работа ў бабруйскіх лячэбных установах. І засталіся задаволеныя.

— Нюансы ёсць заўсёды, — адзначыў Дзмітрый Данілаў. — Дапамога аказваецца, яна годная. Сітуацыя цяжкая, але не крытычная. Цяжкія хворыя ёсць, інфекцыя патэнцыяльна небяспечная, але мы з калегам адзначылі, што людзі ў Магілёўскай вобласці нарэшце надзелі маскі. І гэта цудоўна. Імгненнага эфекту не будзе. Каб меры пачалі дзейнічаць, павінна прайсці ад некалькіх тыдняў да месяца. Але яны абавязкова дадуць станоўчы вынік.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

**❍ КАМПЕТЭНТНА**

**Валерый МАЛАШКА, намеснік старшыні Магілёўскага аблвыканкама, начальнік аператыўнага штаба па рэагаванні на каранавірусную інфекцыю:**

— У вобласці праводзіцца вялікая сістэмная работа. Галоўнае, што жыхары нас пачулі і надзелі маскі. Што датычыцца чыста арганізацыйных пытанняў, то мы кожную раніцу сустракаемся з губернатарам і абмяркоўваем. Калі неабходны якія-небудзь матэрыяльныя або арганізацыйныя рэсурсы, яны заўсёды знаходзяцца. Сёння патрэбны і кіроўцы, і машыны, каб аператыўна выязджаць да пацыентаў на дом. У некаторых бальніцах трэба мяняць сістэму кіслароду, вырашаць пытанні разгортвання ложкавага фонду — складаная сістэмная штодзённая работа на аснове аналізу сітуацыі. Людзі, на жаль, сталі хварэць цяжэй, загружаюцца палаты інтэнсіўнай тэрапіі, рэанімацыі, але мы робім усё магчымае, каб выратаваць кожнае жыццё.

# МТС ПАДАЎЖАЕ АКЦЫЮ «ДЗЯКУЙ ДАКТАРАМ»

**У яе рамках супрацоўнікам аховы здароўя прапануюцца 3000 дадатковых хвілін штомесяц на ўсе сеткі краіны і безлімітны мабільны інтэрнэт з хуткасцю да 1 Мбіт/сек.**



Для таго каб атрымаць бонус, абанентам-медыкам з карпаратыўным тарыфам дастаткова набраць USSD *586# на сваім тэлефоне, а карыстальнікам масавых тарыфаў трэба звярнуцца ў любы ўласны або дылерскі салон сувязі МТС з пашпартам і бэйджам з месца работы.

Дадатковыя хвіліны і інтэрнэт дадаюцца адразу пасля падключэння ў поўным аб'ёме, незалежна ад даты далучэння да акцыі, а затым першага чысла кожнага наступнага месяца.

Удзел у акцыі даступны супрацоўнікам сістэмы аховы здароўя Беларусі, якія абслугоўваюцца па масавых і карпаратыўных тарыфах.

Скарыстаць бонусы ў рамках акцыі можна да 31 студзеня 2021 года.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокія спачуванні намесніку старшыні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Гранкоўскаму Аляксандру Аляксандравічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю МАЦІ.**

# ПРАЦЯГЛАЕ ПАДЗЕННЕ «КВАДРАТА»



## Цэннік пачынаецца з 40 тысяч

Як паведамляе аналітычны цэнтр realt.by, за апошнія сем дзён назіралася зніжэнне цэн на 0,5—0,7 % і яно прасочвалася па ўсіх сегментах кватэр. За мінулы месяц найбольш істотна патаннелі 4-пакаёвыя (мінус 2,4 %) і 1-пакаёвыя кватэры (мінус 2,2 %). Дынаміка цэн у раёнах горада была розная. Невялікі рост назіраўся ў Ленінскім, Савецкім і Фрунзенскім раёнах, без змен — у Цэнтральным і Маскоўскім. У астатніх раёнах Мінска цэны на кватэры знізіліся, прычым прыкметней за ўсё ў Кастрычніцкім раёне — за тыдзень адразу на 2,5 %.

Мікалай Прасталупаў агучыў трэнд, які цяпер назіраецца на рынку. Гэта істотнае патаненне невялікіх па плошчы кватэр, дзе квадратны метр раней ацэньваўся досыць высока. Цяпер сярэдні кошт «квадрата» малых кватэр роўны 1420 доларам (мінус 12 долараў), а двухпакаёвых — 1364 доларам (мінус 9 долараў). Улічваючы такую тэндэнцыю, наш спецыяліст адзначае, што цэннік на бюджэтныя аднапакаёвыя кватэры пачынаецца з 40 тысяч долараў, а двухпакаёвыя — з 50 тысяч долараў.

## Амаль двайная прапанова

Другім істотным трэндам на другасным рынку жылля стала змяненне аб'ёму прапановы. Так, калі сёлета ў студзені гэтая лічба была мінімальная (6200 аб'ектаў), то ў лістападзе колькасць людзей, якія выставілі сваё жыллё на продаж, вырасла амаль удвая (10 400 кватэр і асобных пакояў). За апошні тыдзень колькасць аб'ектаў на рынку вырасла яшчэ на 3,1 %. Дынаміка аб'ёму прапановы застаецца станоўчай ужо дванаццаты тыдзень запар.

Ёсць яшчэ адна тэндэнцыя, звязаная з продажам лецішчаў каля Мінска і прыватных дамоў там жа. За апошнія два месяцы ў базе realt.by з'явілася некалькі дзясяткаў новых — гатовых або практычна гатовых дамоў, якія прадаюцца ў сувязі з пераездам іх гаспадароў. Падобную тэндэнцыю пацвярджаюць і рыэлтары. У некаторых аб'явах прама ўказана прычына продажу. Цэны ў палове такіх аб'ектаў блізкія да сабекошту іх будаўніцтва і адстройвання, акрамя таго, ёсць пазнака «торг». Ці часовая гэта тэндэнцыя, пакажа час.

## Патанненне — мінімум да вясны

Мікалай Прасталупаў лічыць, што ў найбліжэйшыя 30 дзён (з 20 лістапада па 20 снежня) на рынку будзе развівацца переднавагодняя актыўнасць. З прычыны складанай эпідэміялагічнай абстаноўкі гэта будзе менавіта актыўнасць, а не ўжо знаёмы перадсвяточны ажыятаж.

Праўда, падчас павышанага попыту (у параўнанні з іншымі перыядамі) цэны будуць усё гэтак жа павольна паўзці ўніз, упэўнены наш эксперт. Потым будзе «мёртвы» студзень, калі пытаннямі нерухомасці ніхто не займаецца. Нагул, патанненне, на думку спецыяліста, будзе доўжыцца, як мінімум, да мая з тэмпам зніжэння цэн на 1-2 % у месяц.

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## Мінскім чаргавікам прапанавалі кватэры ў Смалявічах

У гэтым горадзе сталічным чаргавікам параілі пабудаваць кватэры ў двух новых дамах. Цэны стартуюць ад 550 долараў за «квадрат» з адстройваннем. Інфармацыю аб кошце і варыянтах апублікавала прэс-служба Мінгарвыканкама.

Згодна з праектнай дэкларацыяй, дольшчыкам прапанавана паўдзельнічаць у будаўніцтве двух дамоў. Адзін з варыянтаў — шматпавярховік 4-секцыйны, да 8 паверхаў, на 112 кватэр (3 аднапакаёвыя, 54 двухпакаёвыя, 53 трохпакаёвыя і 2 чатырохпакаёвыя). Кватэры будуць здадзены з адстройваннем, арыенціровачны кошт «квадрата» — 1400 рублёў (канчатковая цана будзе ўдакладнена па факце заключэння дагавора падраду і пачатку будаўніцтва аб'екта). Пачаць будаўніцтва дома плануецца ўжо сёлета, здаць аб'ект у эксплуатацыю — улетку 2021 года (пры ўмове гатоўнасці аб'ектаў інжынернага забеспячэння).

Другі варыянт — будаўніцтва кватэры ў жылым доме, які будзе 3-секцыйны, 6-7 павярховы. Змяшчальнасць новабудоўлі — 73 кватэры (22 аднапакаёвыя, 35 двухпакаёвых і 16 трохпакаёвых). Кватэры плануецца здаць з поўным выкананнем апрацоўчых работ. Арыенціровачны кошт квадратнага метра жылля — 1550 рублёў. Плануемы пачатак будаўніцтва — снежань гэтага года, увод жылога дома ў эксплуатацыю — чэрвень-ліпень 2021 года.

Кватэры ў гэтых дамах прапануюцца ў «долеўку» чаргавікам з Мінска. Пры гэтым колькасць кватэр падзелена паміж раёнамі прапарцыянальна з колькасцю грамадзян, якія стаяць на ўліку маючых патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў у кожным з іх.

Заявы будуць прымацца з 16 лістапада да 15 снежня 2020 года ўключна. Пры фарміраванні спіса дольшчыкаў будзе ўлічвацца дата пастаноўкі на ўлік, а таксама наяўнасць пазачарговага права на паляпшэнне жыллёвых умоў.

І яшчэ. Кіраўніцтва мегаполіса распарадзілася дапамагчы шматдзетным сем'ям у афармленні крэдытаў на паляпшэнне жыллёвых умоў і паскорыць накіраванне гэтай катэгорыі грамадзян на будаўніцтва жылля. Інфармацыя апублікавана ў Telegram-канале «Мінск. Афіцыйна».

Старшыня Мінгарвыканкама Уладзімір Кухараў адзначыў, што кіраўнікам адміністрацый і аддзелам жыллёвай палітыкі неабходна актывізаваць работу з банкамі і самімі шматдзетнымі сем'ямі, якія стаяць у чарзе на будаўніцтва жылля.

## Арэнда

Попыт на кватэры ў арэнду працягвае зніжацца, аднак саступаць у цане уласнікі кватэр не спяшаюцца. Сезон павышанага попыту сёлета скончыўся раней, чым звычайна — актыўнасць па пошуку здымнага жылля ў Мінску істотна скарацілася яшчэ ў верасні, у кастрычніку падзенне працягнулася (за месяц мінус 3 %). Як вынік, колькасць зацікаўленых у арэндзе кватэр аказалася самай нізкай для сярэдзіны восені за апошнія чатыры гады.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Медыяпрастора

# Інфармацыйная бяспека Саюзнай дзяржавы: выклікі і сучасныя тэхналогіі

**Традыцыйны экспертна-медыйны форум Пастаяннага камітэта Саюзнай дзяржавы, Міжнароднага інфармацыйнага агенцтва «Россия сегодня» прайшоў адразу на некалькіх пляцоўках — у Маскве і Мінску.**

Удзельнікі дыскусій змаглі паразважаць, абмяняцца думкамі, зрабіць пэўныя высновы ў студыях Міжнароднага мультымедыйнага прэс-цэнтра МІА «Россия сегодня» (Масква), Нацыянальнага прэс-цэнтра Рэспублікі Беларусь (Мінск) і Дома прэсы (Мінск). На гэты раз была разгледжана тэма «Інфармацыйная бяспека Саюзнай дзяржавы: сучасныя выклікі і новыя тэхналогіі». З прывітальнымі словамі выступілі Дзяржаўны сакратар Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі Рыгор Рапота, старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па правах чалавека, нацыянальных адносінах і СМІ Генадзь Давыдзька, старшыня Саюза журналістаў Расіі Уладзімір Салаўёў, старшыня Савета дырэктараў газеты «Комсомольская правда», генеральны дырэктар радыёстанцыі «Говорит Москва» Уладзімір Мамантаў, старшыня Камісіі па развіцці інфармацыйнага грамадства, СМІ і масавых камунікацый Грамадскай палаты Расійскай Федэрацыі Аляксандр Малькевіч.

Адна з секцый была прысвечана наступнай тэме — «Інфармацыйная абарона Саюзнай дзяржавы. Сістэмны падыход і аб'яднанне намаганняў». Удзел у яе рабоце прынялі дэкан факультэта філасофіі і сацыяльных навук Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, кандыдат гістарычных навук Вадзім Гігін, палітолаг, галоўны рэдактар партала imchoclub.by Аляксей Дзермант і шэраг іншых палітолагаў, аўтарытэтных экспертаў у галіне мас-медыя. А на тэму масавай дэзынфармацыі, фэйкаў і работы з аўдыторыяй розных медыя паразважалі старшыня Саюза журналістаў Беларусі Андрэй Крывашэеў, дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» Дзмітрый Жук, галоўны рэдактар часопіса «Беларуская думка» Ігар Ганчарук, генеральны дырэктар Цэнтра вывучэння перспектыў інтэграцыі, галоўны рэдактар партала RuBaltik.Ru Сяргей Рэкеда. Апошні, у прыватнасці, прысвяціў сваё выступленне тэлеграм-рэальнасці беларуска-расійскіх адносін.

**Мікола БЕРЛЕЖ.**

Будзь у курсе!

## ДАДАТКОВЫ РУХОМЫ САСТАЎ — ДА НАВАГОДНІХ СВЯТ

**Беларуская чыгунка выдзеліла больш за 70 дадатковых цягнікоў на навагоднія і калядныя святы. З 24 снежня да 11 студзеня таксама будзе павялічана перыядычнасць курсіравання цягнікоў у міжрэгіянальным і рэгіянальным паведамленнях.**

Паводле інфармацыі прэс-цэнтра магістралі, у святочныя і перадсвяточныя дні цягнікі будуць курсіраваць па найбольш запатрабаваных у пасажыраў маршрутах: Мінск — Гомель, Мінск — Брэст, Мінск — Віцебск (праз Полацк, з вагонам Мінск — Друя), Полацк — Мінск, Мінск — Пінск, Мінск — Светлагорск, Гомель — Віцебск, Гродна — Крычаў — Камунары.

У прэс-цэнтры нагадалі, што рэалізацыя праязных дакументаў на цягнікі міжрэгіянальных ліній у межах краіны адкрываецца за 45 сутак да адпраўлення, на цягнікі рэгіянальных ліній бізнес-класа — за 20 сутак да адпраўлення.

Работа па ўвядзенні дадатковых цягнікоў на навагоднія і калядныя святы будзе працягнута.

Факт

## ВЫРАТАВАЛІ ЗАБЛУКАЛУЮ Ў ЛЕСЕ

**У 16.50 ратавальнікам паступіла паведамленне аб жанчыне, якая згубілася ў лясным масіве каля вёскі Зара Свабоды Рэчыцкага раёна.**

У ходзе разбору было ўстаноўлена, што 62-гадовая пенсіянерка каля дзевяці гадзін раніцы сышла ў лес у грыбы і заблукала. На пошукі былі накіраваны ратавальнікі Рэчыцкага раёна, супрацоўнікі РАУС, работнікі Хойніцкага лясгаса. У сувязі з пагаршэннем умоў надвор'я і цяжкасцямі ў пошуках былі прыцягнуты ратавальнікі абласнога ўпраўлення МНС.

У 21.15 пенсіянерка была знойдзена ратавальнікамі ў лясным масіве. Стан жанчыны быў здавальняючы, у медыцынскай дапамозе яна патрэбы не мела.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## Краіны АПЕК+ дамовіліся сачыць за сітуацыяй на нафтавым рынку

Краіны — удзельніцы АПЕК+ па выніках пасяджэння міністэрскага маніторынгавага камітэта дамовіліся працягнуць вывучэнне сітуацыі з попытам і прапановай на рынку ў IV квартале. Таксама яны вырашылі разгледзець сваё далейшыя дзеянні па сусветным нафтавым рынку ў 2021 годзе падчас наступнай міністэрскай канферэнцыі, запланаванай на 1 снежня. Сустаршынямі камітэта з'яўляюцца міністры Расіі і Саудаўскай Аравіі. У пасяджэнні прынялі ўдзел прэзідэнт канферэнцыі АПЕК, міністр энергетыкі Алжыра, а таксама профільныя міністры ААЭ, Кувейта, Венесуэлы, Казахстана, прадстаўнікі Нігерыі і Ірака, а таксама генеральны сакратар АПЕК.

## Навукоўцы заявілі пра выпадкі заражэння COVID-19 у Італіі ў верасні мінулага года

Аб гэтым паведамляецца ў даследаванні для навукова́га часопіса Tumori Journal, падрыхтаваным навукоўцамі з Мілана, Сіены і Пармы. Сярод 959 бессімптомных пацыентаў, якія праходзілі абследаванне на прадмет раку лёгкіх з верасня 2019-га да сакавіка 2020-га, у 111 (11,6 %)



былі выяўлены антыцелы да каранавіруса, адзначаюць навукоўцы. У чацвярых антыцелы былі выяўлены ў першы тыдзень кастрычніка, значыць, яны заразіліся ў верасні, растлумачыў Reuters адзін з аўтараў даследавання Джавані Апалона. «Гэта азначае, што новы каранавірус можа цыркуляваць сярод насельніцтва доўга і з нізкім узроўнем смяротнасці не таму, што знікае, а толькі для таго, каб затым выклікаць новую ўспышку», — адзначыў ён. СААЗ адзначае, што пачала назіраць за сітуацыяй з COVID-19 толькі ў снежні мінулага года з-за пацыента з пнеўманіяй, знойдзенага ў кітайскім горадзе Ухань. У Італіі афіцыйна першыя два выпадкі віруса ўлады выявілі ў канцы студзеня ў кітайскіх турыстаў. Першы выпадак перадачы захворвання ўнутры краіны быў выяўлены тут 21 лютага. Пры гэтым даследчыкі ў сакавіку расказвалі Reuters, што зафіксавалі ў рэгіёне Ламбардыя павышаную колькасць выпадкаў вострай пнеўманіі і грыпу яшчэ ў апошнім квартале мінулага года.

## Заснавальнік Amazon ахвяраваў $791 млн на экалагічныя праекты



Найбагацейшы чалавек свету, заснавальнік амерыканскай кампаніі Amazon Джэф Безас, выдзеліў $791 млн на барацьбу са зменай клімату. Ахвяраванні з Bezos Earth Fund (агульная сума грантаў на ахову прыроды — $10 млрд) першымі атрымаюць 16 экалагічных арганізацый, паведаміў Bloomberg. Сярод іх — Фонд абароны навакольнага асяроддзя, Сусветны фонд дзікай прыроды, Інстытут сусветных рэсурсаў. Сумы грантаў на аднаго атрымальніка склалі ад $5 млн да $100 млн. Безаса актыўна крытыкавалі за нязначны ўклад у філантропію, у тым ліку ўнутры Amazon — за тое, што кампанія ніяк не рэагуе на праблемы, звязаныя са зменай клімату на планеце. Пасля гэтай крытыкі найбуйнейшы ў свеце інтэрнэт-рытэйлер абвясціў аб планах шматкроць павялічыць свой уклад у ахову навакольнага асяроддзя і барацьбу з парніковымі выкідамі, якія негатыўна ўплываюць на клімат Зямлі.

Узаемны інтарэс

# ФУНКЦЫЯНАЛЬНАЯ АДУКАВАНАСЦЬ І ПАДРЫХТОЎКА НАЦЫЯНАЛЬНЫХ ЭКСПЕРТАЎ

**Сумесныя праекты ў галіне ацэнкі якасці адукацыі абмеркавалі ў Маскве міністр адукацыі Беларусі Ігар КАРПЕНКА і міністр асветы Расійскай Федэрацыі Сяргей КРАЎЦОЎ.**

Як паведамляе прэс-служба Міністэрства адукацыі, Беларусь і Расія ўжо маюць вопыт супрацоўніцтва ў галіне ацэнкі якасці агульнай сярэдняй адукацыі. Так, у 2013 годзе Нацыянальны інстытут адукацыі сумесна з Нацыянальным фондам падрыхтоўкі кадраў (Расія) пры падтрымцы Цэнтра міжнароднага супрацоўніцтва па развіцці адукацыі правялі даследаванне «Ацэнка інфармацыйна-камунікацыйнай кампетэнтнасці навучэнцаў 9-х класаў у Рэспубліцы Беларусь».

У 2018—2019 гадах наша краіна ўдзельнічала ў праекце «Лакалізацыя інструментарыя ацэнкі вучэбна-прадметных кампетэнцый SAM у Рэспубліцы Беларусь», які быў нацэлены на вывучэнне ўзроўню сфарміраванасці прадметных кампетэнцый па матэматыцы ў чацвёртакласнікаў. Праведзены папярэднія кансультацыі па працягу супрацоўніцтва ў рамках праграмы READ-2, пачынаючы з 2021 года. Вядзецца падрыхтоўка другаснага аналізу вынікаў міжнароднага даследавання якасці адукацыі PISA-2018 пры кансультатыўнай падтрымцы расійскіх спецыялістаў. Варта нагадаць, што Беларусь удзельнічала ў PISA упершыню, у той час як у Расіі ўжо назапасіўся цікавы досвед.

На сустрэчы з Сяргеем Краўцовым Ігар Карпенка падкрэсліў: «Мы зацікаўлены ў правядзенні міжкраінавых даследаванняў па ацэнцы функцыянальнай адукаванасці навучэнцаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, а таксама пашырэнні супрацоўніцтва са спецыялістамі Расійскай акадэміі адукацыі, Вышэйшай школы эканомікі і іншых устаноў для падрыхтоўкі нацыянальных экспертаў у галіне ацэнкі якасці адукацыі».

Чакаецца, што ў найбліжэйшы час спецыялісты дзвюх краін пачнуць распрацоўку навучальнага дапаможніка па гісторыі Саюзнай дзяржавы. Сёлета ў кастрычніку Камісія Парламенцкага сходу па сацыяльнай і маладзёжнай палітыцы, навуцы, культуры і гуманітарных пытаннях прыняла рашэнне прапанаваць Міністэрству адукацыі Беларусі, Міністэрству навукі і вышэйшай адукацыі і Міністэрству асветы Расіі распрацаваць праект навучальнага дапаможніка па гісторыі Саюзнай дзяржавы. «З беларускага боку для вырашэння гэтай задачы будзе створаны аўтарскі калектыў у складзе вядучых вучоных-гісторыкаў НАН Беларусі і ўстаноў вышэйшай адукацыі. Арганізацыйнае і метадычнае суправаджэнне будуць забяспечваць Нацыянальны інстытут адукацыі і Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы», — расказаў Ігар Карпенка.

У рамках візіту беларускай дэлегацыі ў Маскву запланавана таксама падпісанне Пагаднення паміж Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь і Федэральнай службай па наглядзе ў сферы адукацыі і навукі (Расія) аб супрацоўніцтве ў галіне дзяржаўнай акрэдытацыі ўстаноў вышэйшай адукацыі.

А ў сярэдзіне снежня пройдзе сумесная калегія Міністэрства адукацыі Беларусі, Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Беларусі, Міністэрства асветы і Міністэрства навукі і вышэйшай адукацыі Расіі. «З улікам значнасці гэтага пасяджэння для развіцця супрацоўніцтва прапануем суправадзіць яго такімі мерапрыемствамі, як правядзенне другога этапу Беларуска-расійскага маладзёжнага форуму і Форуму рэктараў Асацыяцыі ВНУ Расіі і Беларусі», — дадаў Ігар Карпенка.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

---

Традыцыі і сучаснасць

# ФІЛАСОФІЯ ЗНАКАЎ І КОЛЕРАЎ

## Чаму не ўсякі арнамент можна змяшчаць на джынсах, чым дрэнныя сучасныя сцэнічныя касцюмы і калі спалучэнне спрадвечных колераў не нясе ў сабе нічога добрага



**ПАДЧАС размовы з этнакультуролагам, кандыдатам філалагічных навук і нашым пастаянным аўтарам Янкам КРУКАМ гэтым разам ледзь не самым папулярным словам было «філасофія». Хоць гаварылі мы пра рэчы больш, здавалася б, прыземленыя — пра сімволіку народнага арнаменту і касцюма, пра спалучэнне асноўных нацыянальных колераў (апошняе ну вельмі модная па сённяшнім часе тэма). Усё аказалася не так проста, і нашмат больш сур'ёзна, чым здаецца на першы погляд. Нехта адмахнецца скептычна: маўляў, зноў палезлі ў містыку. І ўсё-ткі вельмі раю пачытаць гэту гутарку ўсім. Асабліва тым, хто дбае пра захаванне сапраўды народных традыцый і народнай культуры (ці лічыць, што дбае). А містыка... у кожнай, нават самай дакладнай навуцы містычны складнік прысутнічае, ці не так?..**

**А пачалі мы гаворку з арнаменту. Шчыра: я пытался адразу пра той, які сёння на дзяржаўным сцягу. Але ж ключавым словам у нас была «філасофія». І пачаў Іван Іванавіч, як адразу падалося, здалёк:**

— У апошнія гады мы сталі актыўна гаварыць пра тое, што фрагменты нашага арнаменту павінны быць прамаркіраваны на матэрыяльных рэчах, нібыта такім чынам мы паказваем сваю нацыянальную адметнасць і прыналежнасць. І арнамент пачалі ляпіць усюды — і на посудзе, і на адзенні, і на печыве. З аднаго боку, гэта някепска, калі на майцы, на верхнім адзенні мы нанясём знакі нашага арнаменту. З другога — кепска тое, што мы не задумваемся пра сутнасць арнаменту як з'явы спрадвечнай народнай культуры, не стараемся зразумець яе сэнс, не задумваемся пра тое, што гэта не проста прыгожы малюнак. І, не задумваючыся, змяшчаем арнаментальны знак Сонца на кішэню джынсаў ці на бялізну.

***— Давайце тады па-навуковаму, але зразумела растлумачым людзям, што такое нацыянальны арнамент.***

— Гэта сфакусіраваная ў адпаведных знаках гісторыя фарміравання і развіцця нашай этнанацыянальнай культуры. Калі ў 90-х гадах пачалі гаварыць пра гэта менавіта як пра гісторыю, абмінулі адзін важны, на мой погляд, момант. Дакладней, асобныя публікацыі на гэту тэму былі, але яна не атрымала належнага філасофскага абмеркавання. Я маю на ўвазе міфалогію, менавіта ў ёй ляжаць архетыпы нашай падсвядомасці, нашай культуры. І наш арнамент ёсць не што іншае як той самы метатэкст нашай міфалогіі. У ім закадзіраваны нашы багі, і ў ім адначасова закадзіраваны наш род. Тут і нашы легенды пра тое, што ляжыць у аснове стварэння нашай зямлі — галоўны бог Дажбог, бог Сонца Сварог і ніжні гарызонт — Маці-зямля, ад якой ужо пачынаецца культ Роду. Усё гэта простымі знакамі «запісана» ў нашым спрадвечным арнаменце — «зорка» — гэта знак галоўнага Дажбога і яго сына Сонца (вось і думайце, ці варта гэты ўзор маляваць на джынсах ззаду), «ромб» — гэта не што іншае, як засеянае поле Маці-зямлі і адначасова ўлонне Маці, якая працягвае род, «рожкі» на ромбе — знак таго, што поле дасць ураджай, а новы чалавек народзіцца, і будзе працяг. Названыя элементы — «зорка», «ромб» і «рожкі» — гэта ключавыя элементы, якія прысутнічаюць на нашым нацыянальным арнаменце. Усё запраграмавана на дабрабыт і на перспектыву: пад спагадлівым Небам вырастае ўраджай і нараджаюцца людзі. І так бясконца. І менавіта гэты арнамент, менавіта ў такім спалучэнні, выкарыстаны як элемент нашага дзяржаўнага сцяга.

***— Але, мне здаецца, на сцягу ён размешчаны не так, як на тым жа народным адзенні — не гарызантальна, а вертыкальна...***

— Вы маеце рацыю — стваральнікі ўзялі арнамент з народнага адзення абсалютна правільна, але размясцілі яго не зусім кіруючыся правіламі спрадвечнай культуры. Давайце звернемся да нашага традыцыйнага народнага касцюма — дзе і як на ім размешчаны арнамент, — на рукавах, ля шыі, на поясе, на падоле. Арнамент вышыты гарызантальна, а структураваны вертыкальна, бо такіх палосак у касцюме некалькі. Дамінантныя на нашым сцягу два колеры. Чырвоны — адначасова і смерць (кроў) і нараджэнне — карацей, жыццё ва ўсіх яго праявах. Што датычыцца зялёнага колеру, і ў 1951 годзе, калі прыдумвалі сцяг БССР, і ў 90-х, калі прапаноўвалі абноўлены варыянт сцяга, тлумачэнне было такое: маўляў, трэць тэрыторыі займаюць лясы — гэткі сімвал нашай зялёнай зямлі. Трэба, праўда, заўважыць, што калі звяртацца да арнаменту — там зялёная асабліва не знойдзеш — раслінная тэматыка (больш позняя, чым згаданыя элементы) прысутнічае, але выканана больш традыцыйнымі колерамі: чырвоным і чорным... У любым выпадку, на сцягу атрымалася свайго роду карціна — жыццё на зямлі. Тыя мастакі, якія працавалі над кампазіцыяй, над структурай гэтага сцяга, знайшлі адзіна магчымы ход — звязаць два гарызонты — па сутнасці, у сучасным разуменні — нябесны і зямны, вертыкальнай паласой арнаменту. Не падзяліць, як пры гарызантальным выкананні, а менавіта звязаць. Выйсце з пункту гледжання кампазіцыі было знойдзена. А калі пакласці арнамент са сцяга гарызантальна — мы ўбачым, што фактычна ён набліжаны да ідэальнага, да таго, пра што казалі дагэтуль.

***— Арнамент у такім яго сімвалічным напаўненні — свайго роду абярэг на сцягу...***

— Калі мы гаворым, што гэта абярэг, мы зноў спрашчаем філасофію гэтых знакаў да сённяшняга сацыяльнага прагматызму. Гэта не проста абярэг — калі мы напішам дзясяць азначэнняў, абярэг будзе на дзясятым месцы. А на першым — гэта знак апазнавальны, гэта наш знак нябёсаў, пад якімі мы жывём на нашай зямлі (бо напрыклад, у Аргенціне абазначэнне неба і зямлі будзе зусім іншае). Гэта факусіроўка нашай тэрыторыі, адлюстраванне нашага месца ў Сусвеце і ў свеце. Гэта наша філасофія, якая бярэ пачатак з міфалогіі, гэта наш радавод, гэта нашы паданні, легенды і казкі, у якіх усё распісана...

***— Скептык скажа: хіба можна ўсё перапічанае змясціць у вузкай палосцы няхай сабе і сімвалічных узораў?***

— З сямі нот у музыцы атрымліваюцца вялікія найскладанейшыя сімфоніі, якія з захапленнем слухае не адно пакаленне, — вось што можна адказаць на гэта скептыку. У нас увогуле скептыкі пераважаюць. А вось тых, хто мысліць пазітыўна, хоча зразумець сам і растлумачыць іншым не прагматыку, а менавіта філасофію, няшмат. Можа, таму апошнім часам мы занядбалі нацыянальную культуру ў першапачатковым, спрадвечным яе ўвасабленні, замяніўшы на прыдуманую мастакамі копію, якая не мае сэнсавага прачытання. Перш за ўсё гэта датычыцца нібыта народных сцэнічных касцюмаў, якія аздабляюцца «па матывах народнага арнаменту»...

***— Але ж арнамент на сцягу зроблены не «па матывах»?***

— Не. Гэта, хутчэй, эталон, як варта рабіць, гэта тое, што адпавядае моднаму сёння слову і вельмі важнаму заўжды паняццю — самаідэнтыфікацыя.

***— Цяпер даволі часта даводзіцца чуць пра гэткую «геральдычную» містыку. Маўляў, пад гэтым сцягам краіне і народу шанцуе, пад гэтым — не. Як вы ставіцеся да гэтага?***

— Пытанне насамрэч вельмі складанае — па ім асобна можна было б правесці цэлую навуковую — менавіта навуковую — канферэнцыю, дзе гаварылася б і пра філасофію, і пра коды, і пра сімвалы. Прачытаць, разгледзець пад мікраскопам кожны сімвал нашага сцяга і гэтаксама дэталёва разледзець гісторыю нашай краіны, пачынаючы з таго ж 1951 года. І мы ўбачым, што сувязь вельмі цесная. І нічога новага ў гэтым няма. Памятаеце: «Як ты лодку назавеш, так яна і паплыве». Які ты знак (сцяг) абіраеш для сябе (для краіны), каб ісці па жыцці, так гэта жыццё і складзецца. Хочаш ці не хочаш, зрабіўшы выбар, ты становішся ў сімвалічнае, этнакультурнае і перш за ўсё — энергетычнае поле гэтага знака і ідзеш у рэчышчы гэтага знака... Яшчэ трыццаць гадоў таму я казаў і сёння гатовы паўтарыць, ведаючы, якую гэта ў пэўных людзей выкліча рэакцыю. Пад бела-чырвона-белым сцягам мы нікуды не прыйдзем. Таму што такое спалучэнне колераў, хай сабе і спрадвечных беларускіх, абазначае адсутнасць перспектывы. Тлумачу, чаму. Белы — колер смерці, так было спрадвеку ў народнай культуры, белая хустка — хустка жалобы. Чырвоны — колер жыцця. Смерць — жыццё — і зноў смерць — якая тут перспектыва? Калі размова ідзе пра жыццё аднаго чалавека — гэта лагічна. А калі пра цэлы народ...

***— У народным касцюме, пра які мы згадвалі, таксама чырвоны арнамент на белым полі...***

— Калі вы разгорнеце наш традыцыйны ручнік або бабулін фартушок — увасабленне Родавага дрэва — вы ўбачыце, што кампазіцыйнае размяшчэнне іншае. Белы асноўны колер — прыйшлі з небыцця — чырвоны ў арнаменце — прайшлі палоску жыцця — белы ў арнаменце — адышлі ў нябыт — і зноў у арнаменце чырвоны (і ў гэтым прынцыповая розніца!) — пакінулі нашчадка. У гэтай суаднесенасці, у гэтай паслядоўнасці перспектыва, працяг ёсць.

***— Цэлая навука. Як яе данесці, як заахвоціць тую ж моладзь яе спасцігнуць?***

— Наша моладзь сёння вельмі дапытлівая, яна цікавіцца і традыцыямі роднай зямлі, і яе гісторыяй. Але ёй трэба расказваць, тлумачыць з самых малых гадоў. І перш чым прад'яўляць сённяшняй моладзі прэтэнзіі ў няведанні, у эмацыянальнай павярхоўнасці, давайце гэтыя прэтэнзіі адрасуем самім сабе, старэйшым. Мы не дапрацавалі, мы вінаватыя. А цяпер хтосьці пляжыць адзін сцяг, нехта ненавідзіць іншы — і каму ад гэтага лягчэй? Не сцягі вінаватыя, не колеры, Богам дадзеныя і продкамі ўпадабаныя, — людзі, якія проста не разумеюць, не ведаючы, што да чаго.

**Гутарыла Алена ЛЯЎКОВІЧ.**

## «МАМА, ДАЙ ДВА РУБЛІ!»

*Мы гасцюем у свекрыві. Збіраемся на вуліцу пагуляць, як бабуля Аліна просіць зайсці ў краму і набыць такія-сякія прадукты. Не паспелі апамятацца, як перад намі з'явіліся дзве дзесяцірублёвыя купюры. Мой двухгадовы сын схапіў іх і падзяліў пароўну: «Маме адну і Цёму адну». Мы, вядома, пасмяяліся з такога разумніка, але грошы з яго маленькай кішэнькі я ўсё ж такі дастала. Цяпер вось думаю: ці правільна зрабіла?*

*Якраз у «Звяздзе» нядаўна пісалі, што псіхолагі раяць прывучаць дзяцей да кішэнных грошай з маленства. Рэкамендуюць даваць дзіцяці кішэнныя грошы ўжо ў пачатковых класах. Праўда, з удакладненнем, што адны без пяці хвілін «выпускнікі» дзіцячага садка ўжо ўмеюць карыстацца грашыма па назначэнні, у той час як некаторыя старэйшыя за іх дзеці, ужо школьнікі, не разумеюць, для чаго патрэбныя гэтыя рознакаляровыя паперкі ды ўсялякіх калібраў манеты.*

*Майму Цёміку даравальна, калі, гуляючы побач з крамай, ён падыходзіць да патрэбных дзвярэй і кажа: «Хачу цукерку!» І часцей за ўсё гэта адбываецца тады, калі ў мяне няма з сабой ні наяўных, ні банкаўскай карткі. Я тлумачу, што грошай не маю, таму мы проста не зможам разлічыцца ў краме. Цёма ж мяне пераконвае, што «цёця за прылаўкам», іншымі словамі, прадавачка, і так дасць яму тое, што ён пажадае. І я ўжо не маю сілы з ім спрачацца: сапраўды, так яно і ёсць, толькі малы дагэтуль не заўважаў, што ў абмен наўзамен на чупа-чупс я даю гэтай «добранькай» цёці грошы.*

*Але так было летам. Прайшло ўсяго некалькі месяцаў, як каля тых жа дзвярэй малы пытаецца: «Мама, ёсць грошы?» Альбо ўжо каля патрэбнай паліцы, з якой ён хапае свой любімы чупа-чупс, вінавата падымаючыся вочкі, і да мяне даносіцца: «Мама, дай два рублі!» Сёння Арцёмку – два з паловай. Ён разумее, што ў краме проста так ніхто нічога не дае, і нават ведае, што можна купіць за два рублі. Але ён па-ранейшаму малы для кішэнных грошай.*

*Я не памятаю, каб яны ўвогуле ў дзяцінстве былі ў мяне. У дзіцячым садку нават уявіць такое не маглі. У школе абедаў, аплачаных на месяц уперад, хапала. Неабходнасці хадзіць у буфет не было – школа ўсяго ў нейкім кіламетры ад дома. Вядома, ужо ў старэйшых класах хацелася купіць тую ж жуйку ці газіроўку, што бацькі не вельмі ўхвалялі. Даводзілася выкручвацца з сітуацыі: часам не аддаваць усю рэшту бацькам, калі яны даручалі мне нешта купіць у краме. Толькі ці не падман ужо гэта? Недададзеных рублёў бацькі мае не заўважалі, бо брала я вельмі мала, а чэкаў гадоў дваццаць таму ў нашай сельскай краме не выдавалі. Але ці хацела б я, каб так рабіла маё дзіця? Напэўна, не. Лепш самой пакласці яму ў кішэню грошы: няхай вучыцца самастойна распараджацца імі, а галоўнае, не ашуквае блізкіх.*

*З іншага боку, калі запаветныя рублі будуць з'яўляцца там рэгулярна, ці зразумее мой сын каштоўнасць гэтых грошай? Ці навучыцца іх берагчы? Бо, як правіла, гэты навык прыходзіць толькі тады, калі здабываеш грошы ўласнай працай. Як мы ў сярэдніх класах — на бураках ці бульбе, якую наша школа рэгулярна дапамагала выбіраць калгасу. Альбо падчас летняй практыкі, калі ў той час, як твае равеснікі, якія прыехалі ў вёску з горада, купаюцца ў возеры і гойсаюць на роварах, ты полеш усё тыя ж буракі і бульбу, збіраеш у полі камяні ды кідаеш у прычэп трактара... Затое якое шчасце было атрымаць заробленую табой капейку! Праўда, пасля такой нялёгкай працы, якая адымала амаль месяц канікулаў, атрыманыя грошы шкада было пераводзіць у разрад кішэнных. Як правіла, мы ехалі з матуляй у горад і набывалі мне такую доўгачаканую абноўку. А калі ўжо на дзень нараджэння дарылі грошы, што ў маім дзяцінстве рэдкасць, то яны таксама на драбязу не разыходзіліся. Памятаю, як з такіх падарункаў назбірала сабе на першы мабільны тэлефон.*

*Сённяшніх дзяцей грашыма не здзівіш. Мае хросніі ўжо даўно не заказваюць сабе на Вялікдзень падарункі: ім патрэбны выключна грошы. І паболей, бо менш каштоўныя купюры ім штотыдзень даюць на дробныя расходы бацькі. Вось ізноў задумалася: у колькі ж Цёміку пачаць класці ў кішэньку грошы і ці рабіць гэта ўвогуле?..*

**Вераніка КАНЮТА.**


# Сямейная газета

Выпуск № 21 (157)


Тыя, хто побач

**Спявачка ВЛАДА:**

# «Вялікае шчасце, калі ў цябе ёсць сям'я»



Фота Аляксея КАНДРАЦЮКА.

Чатыры пакаленні жанчын: *(злева направа)* бабуля спявачкі і прабабуля Іларыі — Вікторыя Язэпаўна, Влада, Іларыя і Ларыса Іванаўна.

**Упершыню яна выйшла на сцэну ва ўзросце шасці гадоў. Тады, у далёкім 1991-м, маленькая дзяўчынка стала пераможцай у вядомым тэлевізійным конкурсе «Тэлебом», пасля чаго будучую зорку заўважыў Васіль Раінчык і запрасіў у ансамбль «Верасяты». Сёння сольная кар'ера спявачкі прыносіць ёй шматлікія ўзнагароды, выходзяць новыя сінглы і кліпы, яе песні гучаць у рэйтынгавых тэлепраграмах і на радыёстанцыях. За плячамі вакалісткі — вялікі тур па гарадах Беларусі, які яна паспела здзейсніць да пачатку пандэміі. Але, нягледзячы на шматлікія дасягненні ў кар'еры, самым каштоўным для сябе яна лічыць сям'ю. Пра гэта і не толькі мы паразмаўлялі з таленавітай зоркай беларускай эстрады, жонкай, маці і проста прыгажуняй спявачкай Владай.**

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Кніжны свет

## ЯК ПРАЙСЦІ Ў БІБЛІЯТЭКУ І ДЛЯ ЧАГО ГЭТА ПАТРЭБНА

**Знаёмства і сяброўства з кнігай у кожнага чалавека адбываюцца індывідуальна. Таму што ўплыў на гэта аказваюць і час, і атмасфера, у якой расце дзіця, і дарослыя з іх стаўленнем да літаратуры. З дырэктарам ДУ «Цэнтралізаваная сістэма дзіцячых бібліятэк г. Мінска» Таццянай ШВЕД мы пагаварылі пра густы чытачоў, незапоўненыя нішы на беларускім кніжным рынку і прапановы сучаснай дзіцячай бібліятэкі.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

***— Таццяна Аляксееўна, ці з'яўляецца для сучасных дзяцей чытанне цікавым заняткам, з улікам існавання таго ж інтэрнэту?***

— Дзіцячае чытанне, на маю думку, актуальнае заўсёды, бо дзіця нараджаецца, расце, пазнае свет і хоча выказваць свае думкі. У больш дарослым узросце ў яго з'яўляецца ўсведамленне, што веды, якія яно можа здабыць з кніг, спатрэбяцца для таго, каб змяніць свет вакол сябе да лепшага і дасягнуць поспеху ў жыцці. Таму чытанне карыснае і патрэбнае для дзяцей на любым этапе іх сталення. І я тут разглядаю чытанне як працэс наогул, а не толькі наведванне бібліятэкі. Сёння з поўнай адказнасцю сцвярджаю, што нашы дзеці чытаюць. Вядома, нам, бібліятэкарам, хочацца, каб яны чыталі больш друкаваных кніг, больш часу праводзілі ў бібліятэках. Але зараз вельмі вялікі выбар у тым, што чытаць і ў якім выглядзе. Гэта ў нас былі кніжкі, газеты, часопісы і казкі па радыё. А цяпер хочаш — чытай з камп'ютара, з мабільнага тэлефона, альбо купі кнігу ці вазьмі ў бібліятэцы. Галоўнае — правільна сарыентавацца ў тым, што прапаноўвае кніжны рынак, бо ў кожнага свае інтарэсы, свой кірунак у даследаванні навакольнага свету.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

# КАЛІ ДЗІЦЯ «ЖЫВЕ» Ў МАБІЛЬНІКУ

## Як зрабіць гаджэт саюзнікам і не страціць малога і самога сябе ў электроннай прасторы

**Чаму нельга адбіраць у малых тэлефон і з якога ўзросту можна даваць яму гэтую прыладу? Як мабільнік уплывае на мозг дзіцяці і што яго насамрэч развівае? Колькі часу можна праводзіць «у анлайне» і чаму нельга давяраць маркіроўцы «дзіцячы кантэнт»? На гэтыя і іншыя пытанні на адмысловым вебінары «Дзеці ў тэлефоне», які зладзілі ў Школе свядомага бацькоўства «Вялікая Мядзведзіца», адказвае дзіцячы нейрапсіхолаг, навуковец, выкладчыца Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага ўніверсітэта, маці дваіх дзяцей Наталля РАМАНАВА-АФРЫКАНТАВА.**



### Шурпатыя старонкі ці гладкія экраны

Цвярозая бацькоўская пазіцыя адносна гаджэтаў сустракаецца вельмі рэдка. Як правіла, бацькам уласцівыя дзве крайнасці, якія, між іншым, выкліканы аднолькавай прычынай — трывогай за дзяцей. Бацькоўская трывога і няўпэўненасць ствараюць падмурак для канфлікту, бо мама і тата ў такім стане не могуць быць пераканаўчыя.

«Гаджэты — выключна шкодныя, і дзеці не павінны мець доступ ні да смартфона, ні да тэлевізара», лічаць прыхільнікі адной версіі.

— Такія бацькі часта прыходзяць да мяне з праблемай, што дзіця не мае нармальных адносін з аднакласнікамі, бо не валодае тэматыкай камп'ютарных гульняў. Калі ж мы пачынаем працаваць з сям'ёй, высвятляецца, што дзіця не бяруць у кампанію, бо яно транслюе думку, што «ад планшэтаў тупеюць, а тэлефоны замбіруюць». У гэтым выпадку бацькам, якія адчуваюць небяспеку ад гаджэтаў, для ўласнага спакою прасцей цалкам забараніць малым гэтыя прылады, чым прапанаваць ім нейкую альтэрнатыву, — сцвярджае Наталля Раманава-Афрыкантава.

«Сучасныя дзеці нараджаюцца з мабільнікам у руках, нічога з гэтым зрабіць немагчыма, гэта сучасны свет», лічаць прыхільнікі іншага погляду на гаджэты ў дзяцей.

— Нават калі такія бацькі заўважаюць, што малое зашмат часу праводзіць у інтэрнэце, дзесьці глыбока ў душы яны непакояцца, аднак трывогу кампенсуюць думкай, што ў сучасным свеце немагчыма расці без электронных прылад, — акрэсліла псіхолаг.

Часцей за ўсё планшэту супрацьпастаўляюць кнігу, чыста як у вершы Маякоўскага: «Если мальчик любит труд, тычет в книжку пальчик, про такого пишут тут: он хороший мальчик». На перагортванне старонак папяровай кнігі і іх пах мозг чалавека на ўзроўні нервовай сеткі рэагуе выкідам эндарфінаў — гармонаў задавальнення. А пры чытанні электроннай кнігі адчуваецца іх недахоп. Таму меркаванні бацькоў, што кніга — гэта добра, а планшэт з забаўкамі — дрэнна, зразумелыя, аднак яны абмяжоўваюць.

— Бацькі імкнуцца прыцягнуць малых да шурпатых старонак кніг, бо баяцца гладкіх экранаў. Яны баяцца таго, што транслюецца дзецям з экранаў. А прылады не нясуць адну толькі шкоду. Трэба знайсці шляхі, як суцішыць бацькоўскую трывогу, — рэзюмавала эксперт. — Кнігу можна чытаць у тэлефоне, а на планшэце іграць у шахматы. А ёсць электронны кантэнт, які па якасці і ўзроўні не можа параўнацца з папяровым. Напрыклад, шыкоўныя інтэрактыўныя праекты, прысвечаныя Вялікай Айчыннай вайне, дзе ў рэальным часе можна сачыць за прасоўваннем арміі, адкрываць хронікі, адначасова бачыць карты, і гэта сапраўды захапляе.

**З якога ўзросту і колькі часу можна выкарыстоўваць гаджэты (па версіі нейрапсіхолагаў)**

✓ 0-2 і нават 3 гады — забаронена;

✓ 3-5 гадоў — да 20 хвілін у дзень (сумарна);

✓ 5-7 гадоў — да 30 хвілін у дзень, магчыма аб'яднанне часу з мэтай прагляду поўнаметражнага мультфільма;

✓ 7-11 гадоў — да 90 хвілін у дзень;

✓ 11 гадоў і старэйшыя — да 120—180 хвілін у дзень (такі ж час і ў дарослых!)

### Ні тэлевізара, ні кнігі да трох гадоў

Вядома, электронныя прылады нясуць як карысць, так і шкоду, і ў кожным узросце гэта праяўляецца па-свойму.

«Гаджэты псуюць зрок!» Але медыцына ўжо даказала, што сучасныя экраны не маюць недахопаў, якія былі ў ранейшых кінескапічных. Аднак, каб зрок на самай справе не псаваўся, тэлевізар павінен быць не менш як у 2,5-3 метрах ад чалавека, а тэлефон ці планшэт (як і кніга) — на адлегласці сагнутай рукі. А даваць такія прылады малому можна хоць з нараджэння, калі ў яго няма перадумоў для псавання зроку — іх можна чытаць у транспарце, лежачы і ў цемры. Аднак гэта заключэнне ад афтальмолагаў актуальнае толькі для тых, у каго няма схільнасці да паталогій, заўважыла эксперт і падкрэсліла, што нейрапсіхолагі супраць такіх падыходаў:

— Да двух, а лепш да трох гадоў у дзіцяці не павінна быць доступу да экрана. Найперш гэта шкодна для маўленчага развіцця, задача якога — аддзяліць чалавечую мову ад усіх іншых гукаў, якія акружаюць немаўля. Раней гэта было досыць лёгка: дзіця чула мову бацькоў, усё астатняе было гукамі. У нейкі момант малое разумела гэта і пераходзіла на наступны этап развіцця. Цяпер, калі дзіця чуе мову не толькі ад мамы і таты, але і ад гукавога плаката, інтэрактыўнай цацкі ці планшэта, этап сталення вельмі ўскладняецца, бо вызначыць, дзе чалавечая мова, а дзе не, цяжка.

Потым дзіця чуе мову і звязвае яе з артыкуляцыяй дарослых. Але калі яно глядзіць шмат мультыкаў і назірае за артыкуляцыяй аніміцыйных герояў, для правільнага ўспрымання моўнага развіцця таксама спатрэбіцца больш часу. Аднак не трэба глядзець на карыстанне прыладамі радыкальна: калі, напрыклад, бабуля-дзядуля размаўляюць з унукамі праз «Скайп», нічога страшнага тут няма, мяркуе Наталля Раманава-Афрыкантава:

— Важна, каб у раннім узросце атачэнне дзіцяці было аб'ёмнае. Плоская карцінка мультыка, дзе не заўжды вытрымліваюцца прапорцыі, затрымлівае ў малога працэс правільнага прасторавага ўспрымання. Яшчэ адзін важны момант не на карысць гаджэтаў для немаўляці — сэнсорная інтэграцыя, працэс суаднясення інфармацыі, якую дзіця атрымлівае ад розных органаў пачуцця. Прадмет павінен валодаць усімі прыкметамі таго, чым ён з'яўляецца. Цацачная качка, падобная аб'ёмам да сапраўднай, лепш, чым плоская качка на экране планшэта з запісам рэальнага кракання, і нават чым малюнак качкі ў кнізе. Таму да двух-трох гадоў з'яўляецца не карысным і празмернае захапленне кнігамі.

### «Дазіроўка» часу і правілы электроннай кемлівасці

Нейрапсіхолагі рэкамендуюць дазіраваць для дзяцей умоўную колькасць часу каля экрана ў залежнасці ад узросту, прычым гаворка ідзе не пра штодзённы прагляд. Вызначаныя прамежкі часу павінны быць пастаянныя і вытрымлівацца незалежна ад абставін — напрыклад, доўгай дарогі ў машыне ці тэрміновай работы ў бацькоў, калі малому дазваляецца глядзець мультыкі, «абы не перашкаджаў», перакананa Наталля Раманава-Афрыкантава:

— Часта пачаткам залежнасці становіцца доўгая хвароба дзіцяці. Крытычны тэрмін, падчас якога могуць развіцца адыктыўныя (залежныя) паводзіны, калі малы дэманструе залежнасць ад гаджэтаў, — тыдзень. Для некаторых дзяцей пагружэнне ў гаджэт не з'яўляецца праблемай, але для астатніх дастаткова пары тыдняў, каб пачала развівацца залежнасць. Канешне, здараюцца нейкія крытычныя сітуацыі, калі два-тры дні бескантрольнага карыстання са скрыпам, але можна дазволіць. Аднак калі гаворка пра канікулы ці водпуск, то як бы ні было цяжка, дапускаць такое нельга.

**Прыкметы залежнасці дзіцяці ад гаджэтаў**

✓ немагчыма адарваць ад прылады;

✓ складана пераключыцца на нешта іншае, адцягнуць увагу;

✓ капрызы пры немагчымасці выкарыстоўваць гаджэт;

✓ ні паесці, ні заснуць, ні праехацца ў транспарце без планшэта не можа;

✓ не можа заняць сябе без электроннай прылады;

✓ закідвае патрэбнае з-за гульні на гаджэце: не робіць урокі, прапускае трэніроўкі, не выконвае хатнія абавязкі.

Вельмі важная наяўнасць месцаў без гаджэтаў. Дамовіцца, што ў спальні, напрыклад, электронных прылад быць не павінна. Ладзіць дні ці хоць бы гадзіны без гаджэтаў для ўсёй сям'і. Гэта будзе карысна і для дарослых у тым ліку, каб не дзяліць увагу паміж дзецьмі і мабільнікам. Тое ж датычыцца і адносін паміж сужэнцамі, іх гатоўнасці тэрмінова не рэагаваць на кожны піск прылады, перарываючы ўзаемадзеянне аднаго з адным.

Даючы дзіцяці прыладу, з самага пачатку трэба абазначыць правілы электроннай ветлівасці. Напрыклад, ставіць планшэт на паўзу, калі да малога звяртаюцца, і здымаць навушнікі. З іншага боку, «спытаць» вачыма, перш чым загаварыць з дзіцем, ці мажа ён зараз перарвацца — каб гэта не была размова праз Zoom з выкладчыкам, раіць эксперт.

Нельга выкарыстоўваць электронныя прылады падчас ежы. Ежа сама па сабе павінна задавальняць нас, а калі працэс яе ўжывання спалучаць з карыстаннем гаджэтам, то мозг будзе ўспрымаць апошні як неабходную дадатковую крыніцу задавальнення.

Нельга «сёрфіць» у сеціве да сняданку. З моманту абуджэння нашы нейроны вельмі ўспрымальныя да ўсяго, што яны «бачаць» вакол.

Нельга праводзіць перад экранам апошнія дзве гадзіны да сну. У гэты час выпрацоўваецца мелатанін — рэчыва, важнае для рэгулявання перыядаў сну і актыўнасці.

Нельга рабіць гаджэт прадметам супакойвання. Такім чынам нараджаецца ўстаноўка, што калі сумна ці дрэнна, то трэба «залезці» ў інтэрнэт.

Нельга рабіць тэлевізар бясконцым фонам да жыцця. Гэта рассейвае ўвагу.

Да 10—12 гадоў у дзяцей не павінна быць свабоднага доступу ў сеціва. Малым лепш карыстацца прыладамі, на якія скачаны пэўныя відэа- і аўдыяфайлы, кнігі, праграмы. Інфармацыя, якую спажывае дзіця, павінна рэгулявацца бацькамі, таму што сучасныя сістэмы, якія прапануюць аўтаматычны кантроль кантэнту (як, напрыклад, дзіцячы YouTube), на жаль, маркіруюць як «дзіцячае» і шкоднае змесціва інтэрнэту.

— Кантэнт перш за ўсё павінен адпавядаць узросту. Калі ж першакласнік разам з 14-гадовым братам глядзіць падлеткавы фільм, старэйшы ўжо можа разабраць, што кепска, а што не, а вось малодшы можа несвядома пачаць капіраваць паводзіны ўпадабаных герояў, не разумеючы, што ў фільме паказаны ўзор таго, як рабіць нельга, — прывяла прыклад нейрапсіхолаг.

У той жа час тэлеканалы National Geographic ці Animal Planet можна глядзець ужо ў 4-5 гадоў. Галоўнае, каб побач былі бацькі, якія могуць адказаць на пытанні і растлумачыць, што адбываецца, калі паказваюць, як драпежнік есць траваеднага, і расказаць, што ў жыцці так уладкавана. А вось рэклама — шкодная для дзіцяці «страва» і адна з прычын абмежавання свабоднага доступу ў сеціва, каб у малых не сфарміравалася прага да ўсяго і адразу.

Можна прыслухацца да парад экспертаў, можна ісці сваім шляхам, а пасля... шукаць паратунку ў тых жа экспертаў, аднак ведаць прыведзеныя правілы і парады, здаецца, варта ўсім — і «чайлдфры» ў тым ліку. Таму «Сямейная газета» будзе працягваць знаёміць сваіх чытачоў з плюсамі і мінусамі гаджэтаў і меркаваннямі спецыялістаў у гэтай сферы.

**Ірына СІДАРОК.**

**Сюжэты з забароненым для малых кантэнтам: распакоўка цацак (мозг пастаянна ў чаканні навізны і ахоплены жаданнем убачыць, што там з'явіцца яшчэ), праходжанне камп'ютарных гульняў (адрэналін выпрацоўваецца ўпустую, актывізуючы жаданне даведацца, што адбудзецца з гульцом), «бессюжэтныя сюжэты» (у роліку нешта адбываецца, аднак апісаць гэта словамі немагчыма), нежывыя, апрацаваныя камп'ютарам гукі, якімі «гавораць» жывёлы і людзі, і ненатуральныя колеры, формы (шкодна для моўнага і прасторавага развіцця, успрымання малога).**

**Дазволены кантэнт: навігатар (уключыце малому ў тэлефоне і дайце магчымасць, як штурману, давесці вас да дзіцячай пляцоўкі — гэта і цікава, і добра для развіцця прасторавага ўспрымання); правераныя развівальныя праграмы, казкі і мультыкі добрай якасці (савецкія ці сучасныя — на густ бацькоў, галоўнае, каб каштоўнасці ў іх былі агульныя для ўсёй сям'і).**

# «Вялікае шчасце, калі ў цябе ёсць сям'я»

## Жыццё падчас самаізаляцыі

— 2020 год унёс свае карэктывы, таму можна сказаць, што мы нанава адчулі радасці сямейнага жыцця. Калі ў сакавіку «селі» на самаізаляцыю, я ўвогуле адчула тое ж, што і ў дэкрэце — быццам пражываеш «дзень сурка», усё паўтараецца... Гэта спачатку было настолькі нязвыкла, часам нават крыўдна, таму што я ўсё сваё жыццё прысвяціла песні, а тут, калі нават і вельмі захацела б паехаць з канцэртам, проста ўжо фізічна не можаш гэтага зрабіць. Аднак гэты час, мне здаецца, я правяла з карысцю: пачала запісваць песні, адна ўжо ў рабоце, паралельна працуем над новым праектам разам з выканаўцам Alen Hit, аўтарам многіх маіх песень. Менавіта ў гэты цяжкі для ўсіх нас перыяд мы і ўвялі традыцыю сямейных вячэр на прыродзе, каля вогнішча. Дачцэ Ілары вельмі падабаецца смажыць на агні, я нават жартую, што хутка будзем запякаць якога-небудзь парсючка на ражне, бо нам так падабаецца працэс прыгатавання *(смяецца)*. Сямейнае жыццё настолькі мяне змяніла, што я ўжо не ўпэўнена, што хачу бегчы ў тым рытме, у якім знаходзілася апошнія два гады. Тады я выступала з вялікім турам па гарадах Беларусі, дзе сама з'ўлялася і арганізатарам, і артысткай, гэта была вельмі вялікая, напружаная праца. І вось менавіта 2020-ы дазволіў зразумець, што вялікае шчасце, калі ў цябе ёсць сям'я — твой тыл, твая падтрымка.

**«Ведаеце, у мяне ёсць адно простае азначэнне шчасцю — мяне навучыла гэтаму мама. Шчасце — гэта калі няма няшчасця, і на цяперашні момант я магу сказаць, што я шчаслівы чалавек».**

нагрузка вельмі вялікая, гэта я магу сказаць усім матулям. Яшчэ наведваем мадэльную школу. Аказалася, у Ілары для гэтага ёсць усе даныя, тым больш там развіваюць цудоўныя навыкі, якімі варта валодаць любой дзяўчынцы.

## Падтрымка мужа

— Мяне вельмі падтрымлівае муж. Ён займаецца аўтабізнесам і не хоча публічнасці, гэта яго права, якое я, дарэчы, паважаю і падзяляю думку, што шчасце любіць цішыню. Мы даўно вырашылі, што ў нашай сям'і толькі адна «зорка» — я *(смяецца)*. Увогуле, залог добрых сямейных адносін — каб мужчына ўдзяляў ўвагу ўсіх сямейных мерапрыемствах, гэта вельмі важна. Муж любіць бавіць час разам, аднак урокамі займаюся выключна я. Лічу, што да чацвёртага класа з дзіцем трэба рабіць урокі, і гэта справа выключна жанчыны — дзесьці растлумачыць, дапамагчы літарку прыгожа напісаць *(усміхаецца)*. Бывае, думаю, калі б мяне аднойчы паставілі перад выбарам (а я вельмі люблю сцэну): умоўна кажучы, не нараджай, спявай песні, і ты атрымаеш «Grammy» — я разумею, што не трэба мне гэтая ўзнагарода *(смяецца)*. Усё роўна я за сям'ю, мне здаецца, гэта самае важнае, што ёсць у чалавека.

## Фінансавы складнік

— За фінансы ў нас адказвае галава сям'і. Наогул, у мяне ёсць класічная мадэль разумення сям'і, у якой мужчына — здабытчык, ахоўнік, лідар. Тры важныя якасці. У нас ёсць такое паняцце, як «жаночыя» грошы. Дабіцца гэтага насамрэч складана, бо веду вялікую колькасць сем'яў, дзе разышліся менавіта з-за фінансавай недамоўленасці. Я не жонка мужчыны-мільярдэра, якой няма чаго рабіць. Я артыстка і павінна выпускаць якасныя песні, а гэта, вядома,



## Пра дзяцінства і мацярынскі клопат

— Я з самага дзяцінства заўсёды была занятая, марыла стаць спявачкай, і дзякую бацькам, якія, не маючы вялікага дастатку, дапамагалі і падтрымлівалі. Рада, што маё дзяцінства прайшло менавіта так: не было часу ні на гульні, ні на бяздумнае бадзянне з дрэннымі кампаніямі. Я спявала, была ўвесь час занятая, бо існавала мэта — сцэна, нават з хлопцамі не сустракалася, бо не было на гэта часу *(смяецца)*. Але для дачкі такога лёсу, шчыра, не хацела б. Быць спявачкай — гэта сапраўды цяжкі хлеб: сёння ў цябе ёсць работа, ты запатрабаваны, заўтра — з'явіцца новая спявачка, і пра цябе могуць забыць. Вось ужо другі год займаемся фігурным катаннем — гэта было яе жаданне. Пяць разоў на тыдзень у нас трэніроўкі,

патрабуе вялікіх выдаткаў. Таму на ганарары ад канцэртаў я набываю, напрыклад, канцэртныя сукенкі, здымаю кліпы — такім чынам акумулюю свае грошы, зноў жа, у творчасць. А ўсё, што датычыцца побыту, — гэта на мужчыне. Мы так дамовіліся, і пакуль спрэчак на гэты конт не было.

## Падарункі і агульныя інтарэсы

— Для мяне каштоўныя адносіны мужа, што выклікаюць асаблівыя пачуцці, а не нейкія там матэрыяльныя рэчы, якіх, вядома, хапае. З ім я адчула сябе па-сапраўднаму жанчынай, зразумела, што такое «моцнае плячо», гэта насамрэч крута, асабліва калі прывыкла заўсёды разлічваць толькі на сябе.

На маю думку, у сужэнцаў павінны быць агульныя інтарэсы, бо як толькі кожны пачынае глядзець у свой бок — гэта вядзе да

**«Сямейнае жыццё настолькі мяне змяніла, што я ўжо не ўпэўнена, што хачу бегчы ў тым рытме, у якім знаходзілася апошнія два гады».**

астывання і расстання. Пажадана ісці побач адно з адным, а яшчэ лепш разам, узяўшыся за рукі. Напрыклад, у нашай сям'і агульнае захапленне — гэта вандроўкі. Мы доўгі час па розных прычынах не маглі сабе гэтага дазволіць. Актыўна пачалі падарожнічаць толькі апошнім часам, у нас ужо ёсць свой «спіс»: акрамя Турцыі і Егіпта, наведалі Дамінікану і некаторыя іншыя краіны. Абавязкова стараемся наведваць беларускія санаторыі. Увогуле, сямейныя традыцыі прыдумваю я. Вось яшчэ адна з іх — рабіць калажы з фотаздымкамі і подпісамі пра тое, што адбывалася з намі за пэўны перыяд. Гэта вельмі важна і, мне здаецца, цудоўна, калі пра дарагія сэрцу моманты ў жыцці нам нагадвае вось такі самаробны сямейны летапіс!



Фота Маі НОВІКАВАЙ.

Влада з дачкой Ілaрыяй.



## Мамы і дочкі

— Са сваёй сям'і я прынесла разуменне таго, што трэба дапамагаць дзіцяці ва ўсіх яго пачынаннях — так было ў маім жыцці. Цяпер я хачу, як у свой час мая мама, падтрымаць і сваю дачушку. Строгая маці — гэта зусім не пра мяне *(смяецца)*. Як і ўсе, я раблю памылкі, аднак ужо цяпер, калі маю дзіцяці восем гадоў, разумею, што я менавіта мама-сяброўка. Так склалася, што мая матуля Ларыса Іванаўна для мяне таксама блізкая сяброўка, а яшчэ добры псіхолаг — калі што здараецца, адразу ж тэлефаную ёй *(усміхаецца)*. Яна нам вельмі дапамагае і вырашае шмат пытанняў. Калі з'язджаю на гастролі ці здымкі, Ілaрыю адпраўляем да яе, таму дачка вельмі прывыкла да бабулі, нават імёны ў іх сугучныя. У сям'і мы часам называем дачушку Ларай, і ўсе, хто чуе, думаюць, што гэта імя Ларыса. Мы адказваем, што Ларыса — гэта Лора (так у блізкім коле называюць маю матулю). Таму ў сям'і ў нас — Лора і Лара. Такое незвычайнае імя для дачкі я знайшла ў «Энцыклапедыі маладой сям'і» за 1978 год, яно неяк адразу спадабалася, падалося падобным да мамінага. Там жа я некалі знайшла і свой творчы псеўданім — Влада. Звычайна, калі іду па вуліцы і чую імя Віка, ніколі не азіраюся: так ужо прызвычаілася, што мяне ведаюць менавіта як Владу. Вікай мяне называюць толькі самыя блізкія людзі.

**Запісала Надзея ЗУЕВА.**

**Фота з асабістага архіва спявачкі.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## Берагчы тое, што маеш

Для многіх дзяўчатак важна проста выйсці замуж, надзець белую сукенку, бо хочацца свята. Можа, гэта не зусім правільна, аднак у нейкім сэнсе гэта датычылася і мяне, калі я выходзіла замуж першы раз. Цяпер жа скажу, што шлюб не павінен быць самамэтай. Я, напрыклад, не магу быць адна, і сёння знаходжуся побач з чалавекам, з якім камфортна ісці па жыцці, з якім весела і цікава. У мяне былі знаёмыя, якія ўвесь час сварыліся, нават звярталіся да псіхолага, аднак у іх было адно захапленне — яны вельмі любілі збіраць грыбы, а пасля сушыць, варыць, саліць і г. д. І атрымлівалася, што ў перыяд з ліпеня да позняй восені яны жылі душа ў душу, а ўвесь астатні час — не. Павінен быць нейкі агульны інтарэс. Мая парада маладым сужэнцам — трэба знайсці тое, што вас аб'ядноўвае. Зразумела, калі з'яўляюцца дзеці, у жанчыны змяняецца вектар, гэта натуральна — дзіўна, калі было б неяк па-іншаму. І не сакрэт: дзесьці трэба ладзіць рамантычныя вечары, пабыць удваіх, пайсці ў кіно ці проста дома разам паглядзець фільм. Знайдзіце бабулю-памочніцу, да якой з радасцю паедзе ваша дзіця, і вы будзеце разумець, што яму там добра. І, вядома, раю доўга не сварыцца. Мы таксама не ідэальная пара, зразумела, калісьці можам і паспрачацца, але ў нас няма доўгага перыяду маўчання. Неабходна цаніць, любіць і берагчы тое, што маеш, і няхай цацкі параскіданыя па ўсёй кватэры, аднак галоўнае, што вам класна разам — і вялікае шчасце, што вы ёсць адно ў аднаго!

Бацькоўскі сход

# ПАКАРАЦЬ НЕЛЬГА ДАРАВАЦЬ

## Дзе паставіць коску?

**У нашым дзяцінстве, а тым больш, калі дзецьмі былі нашы бацькі, наўрад ці дарослыя задаваліся пытаннем, як правільна «фізічна» выхоўваць сваё дзіця. У савецкім грамадстве лічылася, што некалькі плескачоў ніжэй спіны не прычыняць шкоды, але дададуць розуму. У нашы дні большасць бацькоў — разумныя, адукаваныя сучасныя людзі, якія ведаюць: чалавека біць нельга — ні вялікага, ні маленькага. А крык і плескачы здольныя з часам стварыць прорву неразумення паміж дарослымі і малымі. І гэтая адчужанасць не знікне, калі малое вырасце.**



## А ЦІ ТРЭБА?

Але ўшчуваць дзіця за правіннасці ўсё ж трэба. Іншымі словамі, тлумачыць малому, ды і падлетку, што яго паводзіны былі недапушчальныя (а часам і небяспечныя для яго самога і людзей навокал) і чаму, бо задача бацькоў — навучыць дзіця існаваць у сучасным свеце. У далейшым вашаму сыну або дачцэ прыйдзецца жыць у грамадстве, а значыць, умець шмат у чым добраахвотна абмяжоўваць сябе, каб астатнім было камфортна побач. Усёдазволенасць і патаканне капрызам — шлях да безадказнасці ў дарослым узросце.

***Ірына АСІНОЎСКАЯ, сямейны псіхолаг:***

— Пакаранне дзіцяці — зразумела, не фізічнае! — павінна мець на мэце адну або некалькі важных задач. Перш за ўсё, гэта выпраўленне небяспечных (або недапушчальных у грамадстве) паводзін і прадухіленне паўтарэння падобных учынкаў у далейшым. Таксама гэта ўсталяванне межаў дазволенага і пакрыццё шкоды, прычыненай у выніку дзіцячага ўчынку. Перш чым сарвацца на крык або паставіць малога ў кут, дарослым варта спытаць сябе: што намі рухае? Можа быць, вы проста стаміліся і раздражнёныя? Калі ў вас ёсць хоць бы маленькая няўпэўненасць, караць або не — не карайце.

***Таццяна ТКАЧУК, мама чацвярых дзяцей:***

— Часам бацькі самі вінаватыя ў правіннасцях дзіцяці. Калі вы караеце малога або падлетка занадта часта, падумайце, можа быць, тут ёсць і ваша віна. Напрыклад, я ўзяла за правіла загадзя папярэджваць малодшых: час заканчваць гульню, праз дзесяць хвілін будзем абедаць; пачынай рабіць урокі, інакш не паспееш да заняткаў у студыі выяўленчага мастацтва; хутка мы ідзём дадому з прагулкі, пачынай развітвацца з дзеткамі. Старэйшыя сын і дачка ў мяне падлеткі, і ў не надта прынцыповых пытаннях я часам імкнуся ім саступаць, каб упартасць з іх боку не выклікала ў мяне неабходнасць іх пакарання. Ну, і часам я дазваляю падзеям развівацца натуральным чынам, і тады за непаслушэнства карае само жыццё. Дапусцім, малы не захацеў надзяваць рукавіцы зімой — добра, я пагаджуся. Калі пальчыкі замерзнуць, ён ацэніць парады мамы і перад наступнай прагулкай будзе больш паслухмяны.

## СВЯТА НЕПАСЛУШЭНСТВА

Чаму дзіця не слухаецца, парушае забароны і часам правакуе бацькоў? Адказаў можа быць мноства. Найбольш распаўсюджаныя прычыны апісаны ў псіхалагічнай літаратуры. Гэта могуць быць:

- празмерная колькасць забарон. Імкненне да свабоды — натуральная патрэба кожнай разумнай асобы, а значыць, у адказ на ўвядзенне новых забаронаў вы будзеце атрымліваць жаданне іх парушаць.

- крызіс узросту. На шляху да сталення маленькі чалавек праходзіць праз мноства крызісаў: крызіс 1 года, 3 гадоў, 6- 7 гадоў, славуты падлеткавы крызіс. І, перажываючы гэтыя этапы сталення, ваша дзіця не будзе цацкай;

- бацькоўская непаслядоўнасць. Калі ўчора было можна, сёння нельга, а заўтра зноў можна, узнікае слушнае пытанне: чаму ж сёння нельга?

- разыходжанне бацькоўскіх слоў і спраў. Вы забараняеце дзіцяці гаварыць дрэнныя словы, але самі не-не ды і ўстаўляеце ў сваю прамову моцнае слоўца? Ці абяцаеце: «Вось пачакай, прыйдзем дадому, ты даведаешся, дзе ракі зімуюць!», але пакарання няма, вы забыліся, у вас змяніўся настрой... Любое дзіця — выдатны псіхолаг, яно ўсё прыкмячае. І перастае ўспрымаць вашы словы сур'ёзна;



- недахоп павагі да асобы дзіцяці. Маленькі чалавек расце, і вось ён ужо не малы — але вы не хочаце з гэтым пагадзіцца. Што застаецца дзіцяці? Толькі даказваць, што ён сталее, парушаючы неабдуманыя бацькоўскія забароны;

- разыходжанне ў метадах выхавання ў мамы і таты або бацькоў і бабуль-дзядуль. Калі мама прад'яўляе да малога пэўныя патрабаванні, а тата дазваляе гэтыя патрабаванні парушаць — з паводзінамі ў дзіцяці будуць праблемы (яно будзе разлічваць на абарону з боку таты). Таго ж самага можна чакаць, калі мама і тата ўсталёўваюць для дзяцей нейкія рамкі («ніякага салодкага да абеду», «спаць — роўна ў дзесяць»), а бабулі і дзядулі праз дабрыню душэўную дазваляюць унукам за гэтыя рамкі выходзіць.

***Ірына АСІНОЎСКАЯ, сямейны псіхолаг:***

— Да гэтага спіса я дадала б яшчэ тры важныя пункты. Перш за ўсё гэта недахоп бацькоўскай увагі. Бацькі стамляюцца, у іх часта не хапае сіл і часу для гульняў і заняткаў з дзецьмі. Але нават самыя дасканалыя гаджэты не заменяць матчыных абдымкаў або прачытаную татам перад сном казку. А вось калі дзіця будзе непаслухмянае, бацькі сапраўды звернуць на яго ўвагу. Калі ваш малы зусім адбіўся ад рук, для пачатку паспрабуйце аддаць яму больш любові і клопату. Знайдзіце хоць бы 15— 20 хвілін у дзень, каб пабыць з дзіцем сам-насам, — не памешваючы заадно суп і не праглядаючы навіны, пакуль яно вам нешта расказвае. Засяродзьцеся толькі на ім. Калі дзіця адчуе вашу блізкасць, калі ў яго будзе ўпэўненасць, што вы яго любіце, магчыма, непаслушэнства сыдзе само сабой.

Яшчэ адной прычынай пастаяннага правакавання можа быць жаданне дзіцяці адпомсціць бацькам за старыя крыўды. І дзіця, і падлетак могуць адчуваць сур'ёзны боль з-за разводу мамы і таты, ці, напрыклад, рэўнасць да малодшага брата або сястры. І тут зноў вам дапаможа не пакаранне, а шчырая размова. Калі вы зможаце дапамагчы роднаму чалавечку выказаць свае негатыўныя эмоцыі, то паступова сыдзе і глыбокая крыўда — ён не пацягне яе за сабой у дарослае жыццё. І, зразумела, палепшацца паводзіны.

І, нарэшце, прычынай непаслушэнства можа быць... адлюстраванне вашых уласных паводзін. Дзеці капіруюць бацькоў — гэта адзін са спосабаў сталення. Калі вы прывыклі зрывацца на крык у зносінах са сваімі бацькамі або з мужам, то і ваша дзіця будзе размаўляць з вамі павышаным тонам. Калі вы смаліце цыгарэты на балконе, думаючы, што малое нічога не заўважае, будзьце гатовыя да таго, што ў старэйшых класах яно таксама пачне курыць. Што рабіць? Як заўсёды, пачынаць з сябе. Выхоўваючы дзяцей, не забывайце выхоўваць сябе.

***Наталля ЯДКО, мама дваіх дзяцей:***

— Мне здаецца, перад тым як караць дзіця, трэба паспрабаваць зразумець глыбінныя прычыны яго правіннасці. Калі справа ва ўзроставым крызісе, можа быць, трэба проста ўзброіцца цярпеннем і пачакаць. Калі дрэнны ўчынак быў здзейснены выпадкова, можна пакінуць яго без пакарання — усе мы памыляемся. Ну, а калі дзіця зрабіла дрэннае наўмысна, тады, вядома, яго трэба неяк пакараць. Але вельмі важна, каб ступень пакарання адпавядала цяжару правіннасці.

## ПРЭЗУМПЦЫЯ НЕВІНАВАТАСЦІ

Далёка не ўсе дзіцячыя правіннасці павінны пацягнуць за сабой пакаранне, кажуць псіхолагі. Напрыклад, катэгарычна не варта караць дзіця, калі:

✓ Яно гіперактыўнае (і, дапусцім, разбіла вазу, прабягаючы праз пакой). Або ад прыроды вельмі марудлівае і з-за гэтага рэгулярна спазняецца ў школу: проста падымайце яго крыху раней. Гэта — асаблівасць характару, і караць тут няма за што.

✓ Яно ламае цацкі і іншыя рэчы, каб зразумець, як яны ўладкаваныя, або вымярае глыбіню лужыны... уласнай нагой. Магчыма, у вашай сям'і расце вялікі вынаходнік або падарожнік. Галоўнае — растлумачыць малому, што бяспечна, а што небяспечна ў яго даследаванні свету.

✓ Правіннасць была здзейснена выпадкова: дзіця хацела прыгатаваць сняданак для мамы і таты, але не разлічыла свае сілы і, зваліўшыся з табурэткі, выпадкова перабіла ўсе талеркі. Малое і так засмучанае, а намеры ў яго былі добрыя.

✓ Правіннасць была здзейснена з добрых памкненняў: дзіця падарыла свой тэлефон аднакласніку з малазабяспечанай сям'і ці аддало грошы, якія яму выдзелілі на паход у краму, чалавеку, што прасіў міласціну. Тут варта добразычліва пагаварыць з сынам ці дачкой, растлумачыць сітуацыю і тое, у чым была памылка.

✓ Дзіця праяўляе свае пачуцці — напрыклад, доўга рыдае і не адпускае маму, расстаючыся з ёй раніцай у дзіцячым садку. Гэта нармальна і паступова застанецца ў мінулым.

✓ Яно мае фізіялагічныя асаблівасці — напрыклад, даўжэй за аднагодкаў не можа прывучыцца да гаршка ці ў яго ёсць складанасці з засяроджваннем і ўтрыманнем увагі.

## УСЁ Ж ТАКІ ДАВЯДЗЕЦЦА

Але ёсць правіннасці, за якімі абавязкова павінна адбыцца пакаранне. Гэта наўмысныя ўчынкі, накіраваныя на прычыненне шкоды.

Псіхолагі кажуць: варта караць дзіця за фізічны гвалт у дачыненні да іншых дзяцей (але, зразумела, спачатку бацькам трэба разабрацца ў прычынах бойкі і ў тым, хто быў агрэсарам), за абразу іншых дзяцей, за крадзеж (і зноў спачатку разбіраемся ў прычынах), за дэманстратыўнае парушэнне ўстаноўленых правілаў паводзінаў і хлусню з карыслівай мэтай (хлусню варта адрозніваць ад фантазій — за багатую фантазію караць дзіця, зразумела, не трэба).

Што ж можа быць пакараннем? Зразумела, не фізічнае ўздзеянне, не крык і не праславутае «Марш у кут!». Эфектыўнымі варыянтамі пакарання псіхолагі называюць:

✓ Абмежаванні (доступу да камп'ютара / інтэрнэту або зносін з іншымі дзецьмі). Абмежаванні не павінны быць доўгія.

✓ Самастойнае выпраўленне сітуацыі, якая ўзнікла па віне дзіцяці. Разбіў гаршчок з кветкамі — узяў пыласос і швабру і ўсё чыста прыбраў. Пакрыўдзіў іншае дзіця — папрасіў прабачэння.

✓ Часовая ізаляванасць — цывілізаваны варыянт традыцыйнага «паставіць у кут» (бацькі адводзяць дзіця ў іншы пакой і пакідаюць там ненадоўга адно, каб яно падумала пра свае паводзіны).

***Ірына АСІНОЎСКАЯ, сямейны псіхолаг:***

— Кажучы аб пакаранні дзіцяці, хачу агучыць некалькі правілаў, якія бацькам ніколі не варта парушаць.

✓ Карайце дзіця адразу пасля таго, як яно здзейсніла правіннасць. Дзіця, асабліва маленькае, хутка забывае пра свае ўчынкі і пазней будзе здзіўляцца, за што яго караюць.

✓ Пасля таго як дзіця было пакаранае, не трэба зноў і зноў нагадваць пра тое, што яно зрабіла. Лічыце, што інцыдэнт вычарпаны.

✓ Ніколі не карайце дзіця ў прысутнасці чужых людзей. І малы, і падлетак у гэтай сітуацыі адчуюць сябе прыніжанымі.

✓ Дзіця павінна адчуваць справядлівасць пакарання. Таму ўлічвайце цяжкасць правіннасці і адпаведнасць меры.

✓ Не крычыце — крык хутка пачынае ўспрымацца проста як шумавы фон. Калі дзіця правінілася, найлепшае ўздзеянне на яго акажа не ваш гнеў, а ваша засмучэнне. Дзеці любяць сваіх бацькоў і не хочуць іх засмучаць, а значыць, малое паспрабуе пазбегнуць такіх паводзінаў у будучыні.

✓ Не абагульняйце (ты неахайнік, ты бесталковы, ты лянівы). Гаварыце толькі пра канкрэтную правіннасць.

✓ Падумайце пра свае патрабаванні да дзіцяці: ці ў стане малы або падлетак іх выканаць? Пашукайце варыянты, калі «і ваўкі сытыя, і авечкі цэлыя». Малы размаляваў новыя шпалеры? Можа быць, варта вылучыць яму пэўную сценку, якую не вельмі шкада? Або наклеіць на яе вялікі кавалак белай паперы — і хай малюе.

✓ Дамоўцеся пра адзіную тактыку выхавання паміж сабой і з бабулямі-дзядулямі. Гэта дапаможа малому вызначыцца з тым, што можна, а што нельга, а вам — радзей раздумваць над тым, як заклікаць да парадку юнае пакаленне вашай сям'і.

**Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.**

# ЯК ПРАЙСЦІ Ў БІБЛІЯТЭКУ І ДЛЯ ЧАГО ГЭТА ПАТРЭБНА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Лічыцца, што ў любым выхаваўчым працэсе ўсё пачынаецца з сям'і. Калі гаварыць пра прывіццё любові да кнігі — гэта па-ранейшаму задача бацькоў, ці тут ніяк не абысціся без бібліятэкараў, настаўнікаў?***

— Я цалкам згодная, што ўсё пачынаецца ў сям'і. Добра, калі дзіця з нараджэння расце ў атачэнні кніг. Як яны ў доме могуць з'явіцца? Іх могуць купіць самі бацькі альбо кніжку падораць родзічы, калі прыйдуць у госці. Гэта настолькі ж важна, як набыць немаўляці цацкі і адзенне. Дзіця абавязкова заўважыць кніжкі і зацікавіцца імі ў працэсе вывучэння навакольнага свету. Кніга павінна быць у полі зроку дзяцей — напрыклад, ёсць кнігі, з якімі дзеткі могуць нават купацца. Спачатку іх зацікавяць яркія малюнкі, якія яны будуць проста разглядаць. А потым ужо бацькі могуць пайсці з дзіцем у бібліятэку. Магчыма, яму не адразу стане зразумела, дзе яно апынулася, але калі спадабаецца, то малое зноў папросіць бацькоў туды пайсці. Мы зараз вельмі шмат увагі надаём таму, каб у нас было цікава і самым маленькім наведвальнікам. Імкнёмся і мэблю незвычайную набыць, і дэкарацыі прадумаць, арганізоўваем выстаўкі кніжных навінак... Вядома, не ўсе дзеці, якія прыходзяць у бібліятэку на экскурсію, стануць і застануцца нашымі чытачамі, але ўсё роўна сустрэча з кнігай адыгрывае вялікую ролю. Бо на ўзроўні эмоцый, псіхалогіі — гэта магчымасць для дзетак набыць новы і важны вопыт.

***— Бібліятэка заўсёды прапаноўвае шмат кніг, дзе і класіка, і навінкі. На што арыентуецеся ў працэсе абнаўлення і дакамплектавання сваіх фондаў?***

— Кніжны рынак прапаноўвае надзвычай шырокі выбар рознага кшталту літаратуры. Гэта дазваляе нам папаўняць фонды цікавымі кніжкамі, а чытачам дае магчымасць прыходзіць у бібліятэку і браць для карыстання патрэбныя ім творы. І тут вялікая роля дзяржавы, якая выдзяляе фінансаванне на камплектаванне бібліятэк. Дзякуючы гэтаму мы маем магчымасць набыць любую кнігу, якая з'яўляецца на кніжным рынку. Адсочваем кніжныя навінкі і стараемся набываць іх у дзіцячыя бібліятэкі... Самае галоўнае ў такой рабоце, каб фонды, якія мы фарміруем, выкарыстоўваліся чытачамі. Для гэтага зноў жа праводзім вялікую работу. Так, у кожнай бібліятэцы вядзецца картатэка адмоў — гэта калі наведвальнік прыйшоў па канкрэтную кнігу, а яе ў нас не аказалася. І тады ўжо працуем па прынцыпе дакамплектавання. Таксама праводзім анкетаванне, каб даведацца, якія творы і аўтары маюць попыт у чытачоў.

У нас у Цэнтральнай дзіцячай бібліятэцы Мінска ёсць спецыяльны аддзел, які займаецца камплектаваннем кніжных фондаў сістэмы. Нам важна, каб чытачы мелі магчымасць атрымаць патрэбную кнігу. І ў гэтым, безумоўна, дапамагаюць і самі наведвальнікі, калі пытаюцца пра канкрэтных аўтараў і творы.

***— Якія аўтары і жанры ў сучасных чытачоў карыстаюцца найбольшай папулярнасцю?***

— Зараз кніжны рынак насычаны вельмі добрымі кнігамі для дзяцей розных узростаў, асабліва для самых маленькіх і дашкольнікаў. Афармленне кніжак і іх напаўненне прыемна ўражваюць. А дзеткі цікавяцца гісторыямі пра жывёльны і раслінны свет, пра з'явы прыроды, асабліва любяць казкі. Для падлеткаў пішуць і выдаюць гісторыі пра каханне, чаго таксама не было раней. Коміксы — яшчэ адзін пласт літаратуры, які вельмі папулярны сярод чытачоў. Дзецям больш дарослым падабаюцца дэтэктывы і фэнтэзі. Ім цікавыя гісторыі, дзе героі маюць нейкія звышздольнасці і здзяйсняюць учынкі, якімі хочацца захапляцца. Падлеткі любяць кнігі, у якіх галоўныя героі — іх раўеснікі, дзе можна знайсці адлюстраванне штодзённага жыцця. Бачым інтарэс і да такіх тэм, як хваробы, смерць. Яны хвалююць і цікавяць дзяцей ва ўсе часы. А мы, дарослыя, не заўсёды адважваемся гаварыць з імі пра гэта.

***— Ці ёсць цяпер яшчэ тыя нішы ў літаратуры, дзе добрых і цікавых кніг па-ранейшаму не хапае?***

— Хацелася б больш кніг пра сучасных падлеткаў, бо дзеці нашы чытаюць, але галоўнае — завабіць іх цікавым сюжэтам, добрым аздабленнем. У жанры фэнтэзі пакуль што мала кніг менавіта беларускіх аўтараў. Добра было б, калі б з'явілася больш і навукова-пазнавальнай літаратуры. Дзеці любяць чытаць невялікія па памеры творы — і, думаю, сучасным аўтарам варта звяртаць на гэта ўвагу.

... Беларускі кніжны рынак зараз актыўна развіваецца і многія выдавецтвы імкнуцца выдаваць літаратуру для дзіцячай аўдыторыі. Ідзе няспынны пошук тэм і аўтараў, якія будуць запатрабаваныя сучасным чытачом. Па маіх уласных назіраннях, у гэтым кірунку айчынныя кнігавыдаўцы зрабілі вялікі крок наперад. Таму што тыя кнігі, якія трапляюць у дзіцячыя бібліятэкі, зроблены на высокім узроўні, у іх прыгожыя ілюстрацыі, якасны змест. Добра, калі ёсць работа выдавецтва з аўтарамі па прасоўванні кніг. Сёння мала проста выдаць добрую кнігу. Важна яшчэ і правесці рэкламу, прадумаць, як прэзентаваць навінку чытачам. На якой мове напісаны твор — пытанне не першай важнасці.

***— Але ж па-беларуску чытаюць?***

— У сваёй дзейнасці асаблівую ўвагу мы ўдзяляем літаратуры на беларускай мове. Кнігі пра Беларусь, яе культурную спадчыну, нашых знакамітых дзеячаў заўсёды запатрабаваны дзіцячым чытачом. Нават асобна вядзём улік найбольш запатрабаванай літаратуры на беларускай мове. Лічба гэта штогод расце. Прычынай таму і тое, што мы папулярызуем беларускія кнігі, і фінансаванне дзяржавы, бо дзякуючы яму можам набываць навінкі, і самі выдавецтвы, якія выпускаюць больш кніг на беларускай мове, арыентуючыся на запыты аўдыторыі. Асобна адзначым той момант, што сучасныя маладыя бацькі імкнуцца з самага маленькага ўзросту размаўляць са сваімі дзецьмі і чытаць ім на беларускай мове.

**«Вядома, не ўсе дзеці, якія прыходзяць у бібліятэку на экскурсію, стануць і застануцца нашымі чытачамі, але ўсё роўна сустрэча з кнігай адыгрывае вялікую ролю. Бо на ўзроўні эмоцый, псіхалогіі — гэта магчымасць для дзетак набыць новы і важны вопыт».**

***— Што, акрамя кніг, можа сёння прывесці дзіця ў бібліятэку?***

— У нас праходзіць шмат разнастайных мерапрыемстваў. Дзейнічаюць клубы па інтарэсах, арганізуем дні сямейнага чытання, ладзяцца сустрэчы з пісьменнікамі і многае іншае. Але культурна-асветніцкая работа знітавана з кнігай, таму што бібліятэка — гэта перш за ўсё інфармацыйны рэсурс для дзяцей. І тут проста варта выбіраць тую форму супрацоўніцтва, якая будзе карысная для наведвальнікаў. Не трэба размяжоўваць інтэрнэт і кнігі, лепш весці работу так, каб яны існавалі ў саюзе, што будзе цікава і актуальна дзецям. Вялікую ролю адыгрывае індывідуальная работа з чытачом. Менавіта яна забяспечвае ўсе ўмовы, каб дзіця вярталася ў бібліятэку зноў. Прычым у наступны раз маленькі чытач можа прыхапіць з сабой яшчэ і сябра, калі ўсё спадабаецца. Калі ж у чытальні дзеткі без праблем адшукваюць патрэбныя кнігі, цікава бавяць час, а бывае, і знаходзяць тых, з кім могуць падзяліцца сваімі ўражаннямі, то яны абавязкова прыйдуць яшчэ. У бібліятэцы самае галоўнае — гэта чытач. Бо калі ён прыходзіць да нас і здабывае патрэбныя яму веды, гэта значыць выдатна папрацавалі і мы, і выдавецтвы, і пісьменнікі. Мы існуем дзякуючы сваім чытачам!

**Алена ДРАПКО.**

# ТОП-5 КНІГ ВЫДАВЕЦКАГА ДОМА «ЗВЯЗДА» ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ РОЗНЫХ УЗРОСТАЎ:

### 1. Кацярына Хадасевіч-Лісавая. «Знаёмцеся — Падабайк@!»

Вы хацелі б мець унікальны гаджэт, які ніколі не патрабуе зарадкі, абсалютна не расходуе трафік, не псуе зрок, не «глючыць»? Ён дае карысную інфармацыю, вядзе ў свет фантазіі, пашырае слоўнікавы запас, дорыць магчымасць знаёміцца ў Сусветным сеціве з новымі сябрамі, гуляць у настольную гульню і вясёлую вандрульню з прызам для самых уважлівых і актыўных карыстальнікаў... Барыце ў рукі гэтую кнігу і знаёмцеся з сімпатычным віртуальным героем, якога ведае ўвесь свет.




### 2. Ева Нэм. «Вялікі спектакль для Сонечкі»

Другое выданне ў серыі «Кніга Чараўніцтва». Разам з героямі кнігі пры дапамозе чарадзейнага куфэрка чытачы могуць перанесціся ў мінулыя часы і пазнаёміцца з легендамі і захапляльнымі фактамі беларускай гісторыі, пакатацца па Белавежскай пушчы, навучыцца танцаваць вальс і даведацца шмат цікавай і карыснай інфармацыі, а таксама трапіць на майстар-клас па стварэнні «жывой» кнігі.




### 3. Павел Гушынец. «Тата, раскажы пра мяне гісторыю!»

Навошта Баба-Яга прыляцела ў дзіцячы садок? Чаму самую вялікую лыжку кашы трэба з'ядаць не за маму і не за тату, а за... дзядзьку-сантэхніка? Як растлумачыць хлопчыку-забіяку, што яго паводзіны маглі б быць лепшыя, — пакараць ці пагаварыць? Шукайце адказы на гэтыя і многія іншыя пытанні ў кнізе.




### 4. Анатоль Зэкаў. «Непаслухмяны Чмелік»

З кнігі юныя чытачы даведаюцца, чаму зязюля лічыць гады, як Зорка стала Бярозкай, аб чым крычыць Сойка, чаму птушкі не сівеюць, за што Сароку называюць манюкай, а Чарапаху — лянівай. Кожная казачная гісторыя вучыць дзяцей быць добрымі, спагадлівымі і справядлівымі, перасцерагае іх ад дрэнных учынкаў. У зборнік таксама ўключаны пераклады казак народаў свету.




### 5. Вольга Нікольская. «І зноў агенты «КолбаФірЖык»

Вас чакае дэтэктыўная гісторыя, у якой кемлівыя каты Каўбаса і Кефір ды сабака Рыжык расследуюць таямніцы, трапляючы ў розныя сітуацыі. У новай кнізе знікае якраз адзін з хвастатых агентаў — сабака Рыжык, які ідзе купацца і не вяртаецца. Сляды прыводзяць у пункт часовага ўтрымання жывёл. Але ці здолеюць каты ўратаваць сябра? Бо калі сабаку не забярэ з прытулку новы гаспадар, то ён загіне... Здаецца, у герояў ёсць план!



## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 28, тел.: 8 (017) 298-53-53; 8 (029) 690 54 09, BELTORGI.BY

Продавец: **ОАО «Хойникский КБО»** (УНП 400056519), 247622, Гомельская область, г. Хойники, ул. К. Маркса, 27, тел.: +375 232 31-59-72, +375 29 135-78-72.

Повторные публичные торги в электронной форме будут проведены: **30 ноября 2020 г. с 09.00 до 17.00** на электронной торговой площадке **BELTORGI.BY.**

| № п/п | Предмет торгов | Начальная цена предмета торгов, бел. руб. без НДС |
|---|---|---|
| 1 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4198 | 75,00 |
| 2 | Швейная машина 1022 кл, 2006 г. в., инв. № 4199 | 75,00 |
| 3 | Петельная швейная машина Juki LBH-780U, 2014 г. в., инв. № 4264 | 5145,00 |
| 4 | Петельная швейная машина Typical CBH-781U, 2008 г. в., инв. № 4236 | 2077,50 |
| 5 | Швейная машина Juki DDL8700B-7, 2014 г. в., инв. № 4266 | 1425,00 |
| 6 | Швейная машина Juki DDL8700B-7, 2014 г. в., инв. № 4267 | 1425,00 |
| 7 | Швейная машина Juki DDL8700B-7, 2014 г. в., инв. № 4268 | 1425,00 |

**Местонахождение – Гомельская обл., г. Хойники, ул. К. Маркса, 27. Телефон для ознакомления и осмотра +37529 698 53 53.**

**Для участия в торгах необходимо** в срок с 09.00 20.11.2020 г. по 17.00 27.11.2020 г.: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее чем за день до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – не позднее 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 16.10.2020 г.

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА ОАО «Ивацевичиагротехсервис»

**Предмет торгов – лот:** капитальное строение с инвентарным номером 122/С-20725 (наименование: станция МТП; назначение: здание специализированное для ремонта и технического обслуживания автомобилей (в т. ч. автомобильные заправочные и газонаполнительные станции), площадью 1710,8 кв. м, расположенное по адресу: Брестская обл., Ивацевичский р-н, г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3Б, на земельном участке с кадастровым номером 123450100001004231, площадью 1,7979 га.

Составные части и принадлежности: четыре склада, уборная, здание скважины, скважина, водонапорная башня, ограждение водонапорной башни, забор, площадка асфальтобетонная, водопроводная сеть, канализационная сеть, котельная

| Начальная цена, руб. (с учетом НДС) | 428 233,29 | Размер задатка, руб. | 42 823,33 |
|---|---|---|---|

**Продавец:** ОАО «Ивацевичиагротехсервис», 225295, Брестская обл., г. Ивацевичи, ул. 40 лет Октября, 3, тел./факс 801645 9 21 43. **Организатор аукциона:** Брестский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки». **Р/с для перечисления задатка:** BY76BPSB30121789380179330000 в ОАО «БПС-Сбербанк» Региональная дирекция № 100 по Брестской области, BIC Банка BPSBBY2X, УНП 201028245. **Условия продажи:** без условий. **Срок заключения договора купли-продажи:** в течение 20 рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. **Условия оплаты:** в соответствии с заключенным договором купли-продажи. **Информация о возмещении затрат:** участник аукциона, выигравший торги, оплачивает возмещение затрат Организатору аукциона в течение 3 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона

**Аукцион состоится 08 декабря 2020 г. в 11.00 по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-325**

Сведения о документах, которые необходимо представить для участия в аукционе, правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона www.ocenkabrest.by, также можно узнать по телефонам: 8 (0162) 40-87-01, 40-87-02, 8029 626-72-52

**Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Брест, ул. Наганова, 10-329 в рабочие дни с 9.00 до 17.00**

**Последний день приема заявлений – 07 декабря 2020 г. до 17.00**

Ранее извещение о продаже имущества ОАО «Ивацевичиагротехсервис» опубликовано в газете «Звязда» от 21.04.2020

**В связи с ликвидацией закрытого акционерного общества «Топзапэлектро»**
(протокол № б/н общего собрания акционеров ЗАО «Топзапэлектро», г. Минск от 11.03.2020 г.) **первичная профсоюзная организация закрытого акционерного общества «Топзапэлектро» прекращает деятельность.**

Требования кредиторов могут быть заявлены в течение 2 месяцев с момента опубликования настоящего сообщения по адресу: 220121, г. Минск, ул. Притыцкого, дом 39, офис 8-н, телефон 8-017-318-04-16.

УНП 102390933

## ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

- Каб, не разбіваючы шкарлупіну, даведацца, сырое яйка ці варанае, можна паспрабаваць пакруціць яго на стале, як ваўчок, вакол восі. Варанае яйка будзе круціцца, а сырое, зрабіўшы адзін-два абароты, спыніцца.

УМЕЛЫЯ РУЧКІ

### ШАПАЧКА-ШЛЕМ

***Ёсць такія дзеткі, якім вельмі не падабаюцца шапкі, і пры першай жа магчымасці яны стараюцца іх зняць, а вось з такой справіцца будзе няпроста.***



На памер галавы 45—48 см спатрэбіцца 100 г пражы (120 м / 50 г) і пруткі № 3.

Крыжападобным наборам набраць 50 петляў і вязаць рызінкай 2 на 2 30 радоў (перад), работу адкласці.



Затым таксама звязаць на 50 петляў другую дэталь, але ўжо крыху даўжэйшую — 40 радоў (спінка), далей абедзве дэталі замкнуць у круг і вязаць па крузе 30 радоў.

На пярэдняй палове закрываем сярэднія 18 петляў і працягваем вязанне, закрываючы з кожнага боку ў кожным другім радзе па 2 пятлі пяць разоў, павінна застацца ў рабоце 62 пятлі і вяжам вышыню нашай шапачкі (прыкладна 15 см) і потым дзелім на тры часткі 20, 22, 20 петляў і вяжам, як пятку шкарпэткі, павінны на прутку застацца 22 пятлі, затым вяжам рызінку 1 на 1 па авале твару 10 радкоў і закрываем петлі.



*ЛЯЖЫ, БАБА, — ПАРАНЕЕ (Беларуская народная прымаўка).*

# «ЧЭРЦІ ПАЛІТЫЧНАГА ПЕКЛА»:

## як ва Украіне разгортваецца канстытуцыйны крызіс?



**Паміж украінскім лідарам Уладзімірам Зяленскім і Канстытуцыйным судом краіны разгортваецца маштабны канфлікт. Яго прычынай стала рашэнне інстанцыі абмежаваць паўнамоцтвы Нацыянальнага агенцтва па пытаннях прадухілення карупцыі (НАПК). Гэта выклікала рэзкую рэакцыю ў офісе кіраўніка дзяржавы. Упершыню ў гісторыі краіны ў Вярхоўную раду быў унесены законапраект аб змене ўсяго судзейскага складу, паведаміў rt.com. Занепакоенасць пастановай КСУ выказалі і на Захадзе, прыгразіўшы спыненнем бязвізавага рэжыму для ўкраінцаў. Чаму ва Украіне паглыбляецца супрацьстаянне паміж Канстытуцыйным судом і офісам прэзідэнта краіны і да чаго гэта можа прывесці?**

### МЯЖА КАНТРОЛЮ

У канцы кастрычніка Канстытуцыйны суд Украіны кваліфікаваў палажэнні закона «Аб папярэджанні карупцыі» як неадпаведныя Канстытуцыі, тым самым пазбавіўшы многіх паўнамоцтваў Нацыянальнае агенцтва па прадухіленні карупцыі. З такой ініцыятывай да КС звярнуліся ў жніўні 47 народных дэпутатаў Вярхоўнай Рады, большасць з якіх — прадстаўнікі «Апазіцыйнай платформы — За жыццё». Парламентарыі лічаць немэтазгодным наступленне крымінальнай адказнасці за паведамленне заведама недакладных даных у дэкларацыі або наўмысную непадачу дэкларацыі.

Канстытуцыйны суд задаволіў патрабаванне дэпутатаў. Таксама суддзі вынеслі пастанову аб тым, што паўнамоцтвы НАПК парушаюць Канстытуцыю краіны, у якой замацаваны падзел заканадаўчай, выканаўчай і судовай галін улады. Як адзначыў gazeta.ru кіраўнік Украінскага інстытута аналізу і менеджменту палітыкі Руслан Бортнік, антыкарупцыйная вертыкаль ва Украіне, якая дзейнічала да гэтага рашэння КС, была запушчана не заходнімі партнёрамі. Увядзенне электроннага дэклараравання для ўсіх чыноўнікаў фактычна дазволіла ім атрымаць кантроль над судовай сістэмай. «Яны пачалі кантраляваць падачу дэкларацый, правільнасць іх запаўнення і нават спосаб жыцця суддзяў Украіны. Рашэнне Канстытуцыйнага суда зводзіцца да таго, што электроннае дэклараванне суддзяў павінна быць, але весці яго мусіць не орган выканаўчай улады ў асобе НАПК, паколькі гэта ўмяшанне выканаўчай галіны ўлады ў дзейнасць судовай. На думку КС, гэтым павінны займацца органы судзейскага самакіравання — Вышэйшы савет правасуддзя і Савет суддзяў», — тлумачыць эксперт. Гэта значыць, у рашэнні Канстытуцыйнага суда гаворка ідзе пра тое, хто будзе кантраляваць судовую сістэму. «Яна будзе кантралявацца ці ўкраінскімі элітамі, ці гэтай антыкарупцыйнай вертыкаллю, якая насычана людзьмі [экс-прэзідэнта Украіны Пятра] Парашэнкі і нярэдка прадстаўляе інтарэсы заходніх партнёраў Украіны», — удакладніў Руслан Бортнік.

### ЗНЕШНІЯ КІРАЎНІКІ

Рашэнне суда справакавала рэакцыю Захаду. Кіраўнік прадстаўніцтва Еўрасаюза ва Украіне Маці Маасікас, а таксама часовы паверaны ў справах ЗША ва Украіне Крысціна Квін у той жа дзень сустрэліся з кіраўніком Канстытуцыйнага суда Аляксандрам Тупіцкім.

Рэпутацыя Украіны ў вачах заходніх партнёраў апынулася пад пагрозай — стварэнне НАПК як агенцтва, якое павінна займацца зборам і аналізам электронных дэкларацый аб даходах дзяржаўных служачых, было адной з умоў бязвізавага рэжыму з ЕС.

Стабільнае функцыяніраванне антыкарупцыйнай сістэмы ў краіне — гэта паранейшаму адзін з ключавых пунктаў для атрымання фінансавых траншаў ад партнёраў Украіны. Еўрасаюз непасрэдна заклікаў адмяніць рашэнне КС, адзначыўшы, што яно падрывае выкананне міжнародных абавязацельстваў Кіева, неабходных для атрымання €1,2 млрд. макрафінансавай дапамогі ад ЕС і захавання бязвізавага рэжыму. «Рашэнне Канстытуцыйнага суда Украіны ад 27 кастрычніка па шэрагу элементаў антыкарупцыйнага заканадаўства будзе мець самыя шырокія наступствы для ўсёй антыкарупцыйнай інфраструктуры ва Украіне», — адзначаецца ў распаўсюджанай заяве знешнепалітычнай службы Еўрасаюза.

Між тым, дэпутаты, якія звярнуліся ў Канстытуцыйны суд, абгрунтоўваюць сваё рашэнне неабходнасцю лiквідаваць механізм кантролю над усімі ўкраінскімі чыноўнікамі, які вядзецца Захадам.

«Уся сістэма так званых антыкарупцыйных органаў служыць выключна адной мэце: трымаць на кручку знешніх кіраўнікоў увесь палітычны і кіруючы клас Украіны. Адсюль і ўсё выцдзе з нагоды сённяшняга рашэння Канстытуцыйнага суда, што пазбаўляе Захад часткі (далёка не ўсіх) інструментаў татальнага кантролю над усімі ва Украіне», — напісаў у Facebook адзін з аўтараў звароту ў КС дэпутат Алег Валошын.

Прэзідэнт Украіны выразна ўвесь час паскорыў умяшацца ў сітуацыю. Уладзімір Зяленскі сабраў экстранную нараду Савета нацбяспекі Украіны, каб абмеркаваць рашэнне КС. «Мы вымушаны канстатаваць, што ў апошні час з'явіліся прыкметы таго, што асобныя суб'екты спрабуюць перагледзець ключавыя часткі грамадскай дамовы ва Украіне, якія прадугледжваюць нулявую талерантнасць да карупцыі і любой формы непразрыстасці ў дзяржаўным кіраванні. Гэта недапушчальна», — заявіла прэс-служба прэзідэнта па выніках сустрэчы.




### НЕ ХАПАЕ ПАЎНАМОЦТВАЎ

У паведамленні таксама адзначалася, што неабходныя законапраекты, якія прадухіляць узнікненне падобных крызісных сітуацый у далейшым, будуць распрацаваны і ўнесены прэзідэнтам у Вярхоўную раду як неадкладныя. Пасля пасяджэння Зяленскі ўнёс у парламент законапраект аб звальненні ўсіх членаў Канстытуцыйнага суда. Аднак праблема ў тым, што Рада не надзелена такімі паўнамоцтвамі і, паводле Канстытуцыі, адправіць членаў КС у адстаўку могуць толькі самі суддзі шляхам галасавання.

Пасля прэзідэнт апублікаваў на сваёй старонцы ў Facebook пост, у якім заявіў, што рашэнне Канстытуцыйнага суда накіравана асабіста супраць яго. «Я дакладна ведаю, што сённяшні дэмарш Канстытуцыйнага суда — гэта публічнае праяўленне змовы часткі старых эліт і алігархаў супраць прэзідэнта і супраць краіны. Ніяк інакш», — напісаў кіраўнік краіны. Зяленскі растлумачыў, што суддзі сваімі дзеяннямі фактычна «супрацьпаставілі сябе дзяржаве і грамадству», імкнучыся захаваць «касту недатыкальных». «Інакш яны не ўмеюць. Як там кажуць — на Хэлаўін усе чэрці з палітычнага пекла адкрываюць свае сапраўдныя твары. Так супала», — заўважыў прэзідэнт Украіны. На яго думку, члены КС «доўга сядзелі ў засадзе», пакуль не пачаліся праверкі дэкларацый чыноўнікаў. «І вось тут яны ўсе спалохаліся. Вельмі моцна. І адразу захацелася выйсці з усіх дамоўленасцяў па стварэнні іншай, празрыстай рэальнасці. Знойдзены фармальныя падставы. І раптам Суд у паскораным фармаце пачынае разглядаць і адмяняць фундаментальныя законы», — выказаў сваю версію падзей Уладзімір Зяленскі.

Акрамя таго, прэзідэнт прыняў удзел у ток-шоу «Свабода слова», у якім зноў паўтарыў сваю пазіцыю, падкрэсліў, што не збіраецца адклікаць законапраект, і нават дапусціў роспуск парламента. Паралельна з гэтым, як паведамляюць мясцовыя СМІ, Зяленскі сустракаўся з дэпутатамі сваёй партыі «Слуга народа», каб пераканаць іх падтрымаць законапраект аб звальненні суддзяў. Аднак, паводле інфармацыі strana.ua, у шэрагах кіруючай партыі ініцыятыва прэзідэнта выклікала збянтэжанасць з-за яе неадпаведнасці Канстытуцыі.

2 лістапада ў ходзе пасяджэння пагаджальнага савета кіраўнікоў фракцый і камітэтаў парламента катэгарычна супраць падтрымкі законапраекта кіраўніка дзяржавы выказаліся «Апазіцыйная платформа — За жыццё», «Еўрапейская салідарнасць» Пятра Парашэнкі, «Бацькаўшчына» Юліі Цімашэнкі і дэпутацкая група «За будучыню».

«Прапанаваны законапраект неканстытуцыйны. Ён супярэчыць існуючым нормам заканадаўства ў частцы тэрмінаў паўнамоцтваў суддзяў, якія нельга ўзяць і ўсё так абмежаваць, фактычна пазбавіўшы суд гарантый незалежнасці. Унясенне законапраекта ў такой рэдакцыі можа быць падставай для імпічменту прэзідэнта. Што ж датычыцца дэпутатаў, тых, хто галасуе за прыняцце закона і найгрубейшым чынам парушае Канстытуцыю Украіны, то іх дзеянні таксама можна разглядаць у рамках Крымінальнага кодэкса, як захоп дзяржаўнай улады і ўмяшанне ў работу Канстытуцыйнага суда Украіны», — заявіў strana.ua юрыст Расціслаў Кравец.

### МАТЫЎ ДЛЯ «МАЙДАНА»

Як заўважыў намеснік дырэктара Інстытута гісторыі і палітыкі МПДУ Уладзімір Шапавалаў, паслы краін G7 занепакоеныя адсутнасцю ва Украіне зрухаў у пытанні барацьбы з карупцыяй. «На Захадзе прынята закрываць вочы на тыя карупцыйныя схемы, якія ёсць ва Украіне, але гэтая сітуацыя з Канстытуцыйным судом занадта скандальная», — растлумачыў эксперт.

Крыніца rt.com у прадстаўніцтве Еўрапейскага саюза ва Украіне паведаміла: у ЕС усведамляюць, што ўкраінскія ўлады «гатовыя адмовіцца ад абавязацельстваў, якія яны на сябе ўзялі па электронным дэклараванні даходаў». І Еўрапейскі саюз сапраўды можа прыпыніць дзеянне бязвізавага рэжыму ў тым выпадку, калі доступ да электронных дэкларацый будзе закрыты».

Як патлумачыў rt.com украінскі палітолаг Аляксандр Семчанка, заходнія краіны, у прыватнасці, членаў ЕС зусім не хвалюе праблема карупцыі як з'ява, якая аслабляе патэнцыял развіцця Украіны. «Захад хвалюе карупцыя як інструмент, пры дапамозе якога яны змогуць трымаць у руках ніткі кіравання ўкраінскімі палітыкамі», — заўважыў аналітык.

«Вынік барацьбы з карупцыяй нулявы. Карупцыя перамагла ўкраінскую ўладу, і для барацьбы з ёй не прымаюцца нават імітацыйныя меры», — адзначыў rt.com намеснік дырэктара Інстытута гісторыі і палітыкі МПДУ Уладзімір Шапавалаў.

«Зяленскі стаў чарговым расчараваннем для ўкраінцаў, і гэта добра паказалі вынікі мясцовых выбараў, якія прайшлі ў мінулыя выхадныя. Зяленскі расчароўвае заходніх партнёраў, якія разумеюць, што словы прэзідэнта пакуль не супадаюць з яго дзеяннямі. Таму адказ ЗША і Еўрапейскага саюза будзе жорсткі. Адмена бязвізавага рэжыму — і ў Кіеве пачнецца новы «майдан». Усё залежыць ад здольнасці Зяленскага хутка вярнуцца на шлях, які яму накрэсліць на Захадзе», — заўважыў rt.com прадстаўнік «Еўрапейскай салідарнасці».

### РЭАЛЬНАЯ ЎЛАДА

Як адзначыў Уладзімір Шапавалаў, «тая карумпаваная палітычная сістэма, што была характэрная для Украіны апошніх гадоў, асабліва пры Парашэнку, праігрываецца цяпер у поўнай меры». «Менавіта карупцыя з'яўляецца рэальнай уладай ва Украіне, а не прэзідэнт, які фактычна стаў кульгавай качкай, якую выштурхвае сістэма і якая атрымлівае адну паразу за другой. І рашэнне Канстытуцыйнага суда — яшчэ адзін таму доказ. Бо за ім, відавочна, стаіць вялікі кланавы ўкраінскі бізнес, што карумпуе дзяржаву», — сказаў аналітык.

Пры такім раскладзе ўкраінскія ўлады «замест таго, каб выправіць правапрымяняльную практыку, прымаюць законы, якія папросту не дзейнічаюць», лічыць Аляксандр Семчанка. Эксперт дапусціў, што ў Вярхоўнай радзе можа з'явіцца чарговы законапраект па барацьбе з карупцыяй, за які ў выніку прагаласуюць. «Прэзідэнт яго падпіша, ён стане часткай нарматыўна-прававога поля. Нічога, праўда, на справе не зменіцца, карупцыі не стане менш, але Зяленскі зможа зноў расказваць, як ён перамагае карупцыйныя схемы», — заўважыў аналітык.

Тым часам Венецыянская камісія Савета Еўропы прапанавала дапамагчы Украіне ў распрацоўцы канкрэтных рашэнняў па ўрэгуляванні сітуацыі. Еўрапейцаў занепакоіла паспешлівае рашэнне Зяленскага адправіць у адстаўку поўны склад КС. На думку Венецыянскай камісіі, калі Канстытуцыйны суд усё ж такі будзе распушчаны, то гэта стане парушэннем Асноўнага закона краіны ў частцы падзелу ўлады. Па словах в. а. старшыні групы падтрымкі Украіны ў Еўракамісіі Катарыны Мацярновай, пакуль няма простых адказаў і простых рашэнняў для выхаду з сітуацыі. Здаецца, канкрэтыкі становіцца ўсё менш.

**Пётр ДУНЬКО.**

Извещение о проведении повторных* торгов в форме открытого аукциона ЗАО «ТК Банк»

## ЗАО «ТК Банк» проводит повторные торги в форме открытого аукциона по продаже следующего имущества

| Номер лота | Наименование | Адрес | Площадь, м² | Дата ввода в эксплуатацию | Начальная цена предмета торгов с учетом НДС, бел. руб. | Размер задатка, бел. руб. | Сумма шага аукциона, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Изолированное помещение с инвентарным номером 100/D-125545 | г. Брест, ул. Советская, 34-1 | 11 957,1 | 20.08.2013 | 22 700 000,00 | 113 500,00 | 1 135 000,00 |

Торги состоятся **30 ноября 2020 года** в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Тимирязева, 65а. Участие в торгах оформляется заявкой на участие в аукционе. Заявки принимаются с 9.00 19 ноября 2020 года до 17.00 26 ноября 2020 года.

Для участия в торгах юридические и физические лица представляют следующие документы:

- письменную заявку на участие в торгах с указанием о наличии заинтересованности приобретения имущества на условиях отсрочки (рассрочки) платежей;

- подписку о том, что у них нет препятствий, предусмотренных законодательством, для приобретения имущества;

- документы, подтверждающие платежеспособность (при наличии заинтересованности приобретения имущества на условиях отсрочки (рассрочки) платежей):

юридические лица:

- справку из обслуживающего банка об оборотах по счетам, наличии требований в АИС ИДО и обременений за последние 3 месяца;

- согласие на получение кредитного отчета;

- согласие на предоставление и получение сведений из информационных ресурсов, находящихся в ведении МВД и НБРБ;

- запрос о наличии сведений о физическом лице в банках данных, находящихся в ведении МВД РБ – в отношении руководителя компании;

юридические лица, применяющие стандартную систему налогообложения:

- бухгалтерский баланс с отчетом о прибылях и убытках – за последний отчетный год и последний отчетный квартал;

- расшифровку дебиторской и кредиторской задолженности, расшифровку статей баланса «Краткосрочные кредиты и займы», «Долгосрочные кредиты и займы», «Прочие долгосрочные обязательства» – на последнюю отчетную дату;

юридические лица, применяющие упрощенную систему налогообложения:

- книгу учета доходов и расходов организаций и индивидуальных предпринимателей, применяющих упрощенную систему налогообложения – за последний отчетный год и по состоянию на последнюю отчетную квартальную дату;

- налоговые декларации по налогу при упрощенной системе налогообложения, а также документы, подтверждающие уплату налога – за IV квартал предыдущего отчетного года и за последний отчетный квартал;

- расшифровки краткосрочных и долгосрочных кредитов и займов, иных обязательств, справки о наличии просроченной дебиторской и кредиторской задолженности, расчет величины активов;

физические лица:

- справку о заработной плате и (или) иных доходах за последние 3 месяца;

- согласие на получение кредитного отчета;

- согласие застрахованного лица на получение информации при оказании электронной услуги ОАИС;

- запрос о наличии сведений о физическом лице в банках данных, находящихся в ведении МВД РБ.

Для участия в торгах допускаются юридические и физические лица, внесшие задаток, кредитоспособность которых установлена уполномоченным органом ЗАО «ТК Банк».

Сумма задатка должна быть внесена на текущий (расчетный) банковский счет продавца не позднее 27 ноября 2020 года. Получатель платежа: ЗАО «ТК Банк», УНП 807000163, р/с BY28BBTK66700027600000000933, БИК BBTKBY2X. Назначение платежа: задаток за участие в аукционе.

Победителем аукциона признается участник, предложивший наибольшую цену. В случае признания торгов несостоявшимися по причине подачи заявления только одним участником, предмет аукциона может быть продан этому участнику с его согласия с увеличением начальной цены аукциона на 5 процентов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения в любое время, но не позднее чем за 3 (три) рабочих дня до наступления даты его проведения.

Результаты торгов оформляются протоколом торгов, который подписывается победителем аукциона (покупателем – единственным участником) в день проведения торгов. Победитель аукциона обязан заключить договор купли-продажи с продавцом в течение 5 (пяти) рабочих дней с даты проведения аукциона. Срок оплаты – после государственной регистрации договора купли-продажи; при необходимости предоставляется отсрочка платежей, за исключением авансового, на 2 года с уплатой стоимости имущества на условиях рассрочки (равными ежемесячными платежами) в течение последующих 5 лет. Задаток засчитывается в счет авансового платежа. Переход права собственности на приобретаемое имущество происходит после оплаты авансового платежа, равного сумме задатка – для юридических лиц, или равного 10 % от цены лота – для физических лиц. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, а также государственной регистрацией договора купли-продажи и перехода права собственности, несет покупатель.

Ознакомиться с предметом аукциона можно, связавшись с продавцом по тел. (+375 17) 270-80-00 (Мальков Сергей Владимирович, Янушкевич Сергей Анатольевич) или на сайте https://tcbank.by/about/selling. Продавцом и организатором торгов выступает ЗАО «ТК Банк», г. Минск, ул. Тимирязева, 65а.

** – Извещения о проведении предыдущих торгов были опубликованы в газете «Звязда» от 04.08.2020, 16.09.2020, 01.10.2020, 20.10.2020 и 04.11.2020.*

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

## ОРГАНИЗАТОР АУКЦИОНА – ЧЕРВЕНСКИЙ РАЙОННЫЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ

| № лота | Сведения о виде и предмете аукциона | Адрес объекта и его наименование | Срок аренды | Начальная цена объекта (рублей) | Сумма задатка (рублей) | Расходы по организации и проведению аукциона (рублей) | Ограничения (обременения) прав в использовании земель и другие ограничения |
|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | Аукцион на право заключения договора аренды земельного участка | Земельный участок для строительства и обслуживания многофункционального комплекса, расположенного по адресу: Минская обл., Червенский р-н, г.п. Смиловичи, площадь – 0,4455 га, кадастровый номер 625883590601001720 | 99 лет | 54 874,46 | 5 487,45 | 4465,79 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель: охранные зоны электрических сетей напряжением свыше 1000 В, площадью 0,2391 га; водоохранная зона реки Волма площадь – 0,4455 га |
| 2 | | Земельный участок для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса (СТО), расположенный по адресу: Минская обл., г. Червень, 63-км автодороги М-4 Минск-Могилев, площадь 0,5178 га, кадастровый номер 625850100001003786 | 50 лет | 41 770,08 | 4 177,01 | 1 826,72 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничение (обременение) прав в использовании: охранная зона линий связи и радиофикации, площадь – 0,0318 га |
| 3 | | Земельный участок для строительства и обслуживания объекта придорожного сервиса в городе Червене Минской области (63 км автодороги М-4 Минск-Могилев), расположенный по адресу: Минская обл, Червенский р-н, г. Червень (63 км автодороги М-4 Минск–Могилев), площадь 0,5000 га, кадастровый номер 625850100001003770 | 50 лет | 42 092,45 | 4 209,25 | 2517,19 + расходы по размещению извещения в СМИ | Земельный участок имеет ограничение (обременение) прав в использовании: охранная зона линии связи и радиофикации, площадью 0,0252 га |

Задаток перечисляется на расчетный счет BY94 AKBB3641062700002600 0000 в ЦБУ 627 филиала № 500 МУ ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК AKBBBY2X, УНП 600008398. Оплата объекта аукциона (включая затраты, связанные с его проведением) должна быть осуществлена в течение 10 рабочих дней со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона. Для участия в аукционе представляются: заявление, документ, подтверждающий внесение суммы задатка, с отметкой банка, а также иные документы, предусмотренные Положениями о порядке организации и проведения аукционов на право заключения договоров аренды земельных участков и продажи земельных участков в частную собственность, утвержденными постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26 марта 2008 г. № 462. При подаче заявления заключается соглашение с райисполкомом о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Аукцион проводится при наличии не менее двух участников.

Аукцион состоится **18 декабря 2020 года в 11.00** в здании Червенского райисполкома (зал заседаний) по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1. Заявления на участие и необходимые документы принимаются с момента опубликования извещения в рабочие дни с 8.00 до 17.00 по адресу: г. Червень, пл. Свободы, 1, райисполком, кабинет 69, тел.80171428491 по **16 декабря 2020 года** включительно.

# ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ

## по объекту: «Многоквартирный жилой дом по генплану № 57 в микрорайоне Сухарево-5» в г. Минске

**1. Сведения о застройщике.**

Государственное предприятие «УКС Центрального района г. Минска» зарегистрировано в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей 20.02.2014 за № 190580566. Юридический адрес: 220035, г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7. Режим работы: понедельник – четверг с 8.30 до 17.30, пятница с 8.30 до 16.15. Обеденный перерыв с 13.00 до 13.45.

Выполняя функции заказчика, в течение последних трех лет Застройщиком построены и введены в эксплуатацию объекты:

- жилой дом № 8 по ул. Камайская, фактический срок строительства – 15 месяцев;

- жилой дом № 7Б по ул. Нововиленская, фактический срок строительства - 9 месяцев;

- жилой дом № 121 по пр. Победителей, фактический срок строительства – 18 месяцев;

- жилой дом № 15 по ул. Павлины Медёлки, фактический срок строительства – 9 месяцев;

- жилой дом № 5 по ул. Павлины Медёлки, фактический срок строительства – 10 месяцев;

- жилой дом № 20 по ул. Выготского, фактический срок строительства – 13 месяцев;

- жилой дом № 7 по ул. Павлины Медёлки, фактический срок строительства – 8 месяцев.

- усадебные жилые дома № 1,7,9,11 по ул. Лапоровичская, № 20,22 по ул. Пильницкая, блокированные жилые дома № 2,4,7,12,14,16 по ул. Пильницкая – фактический срок строительства – 36 месяцев,

- квартира в блокированном доме № 6 по ул. Пильницкая – фактический срок строительства – 39 месяцев.

Цель строительства объекта общей площадью квартир 4 153,92 кв. м – увеличение уровня обеспеченности населения жильем Строительство осуществляется за счет средств физических лиц.

Начало строительства объекта – ноябрь 2020 г.

Предполагаемый срок приемки объекта в эксплуатацию – ноябрь 2021 г.

По проектно-сметной документации получено положительное заключение РУП «Госстройэкспертиза» от 13.11.2019 г. № 606-15/19.

Земельный участок передан Государственному предприятию «УКС Центрального района» решением Мингорисполкома от 24.09.2020 г. № 3146.

Генеральный подрядчик – ОАО «МАПИД» (договор генподряда № 30/09-20 от 30.09.2020).

Компенсация в установленном порядке бюджету г. Минска стоимости жилых помещений, предназначенных для переселения граждан из жилых домов, подлежащих сносу в связи с предоставлением земельных участков под жилищное строительство производится путем перечисления в бюджет г. Минска денежных средств, исходя из рыночной стоимости общей площади подлежащих передаче жилых помещений в объекте в соответствии с договором от 31.08.2020 № 10, заключенном с Мингорисполкомом.

**2. Характеристика объекта**. Участок для строительства многоквартирного жилого дома находится в границах ул. Пимена Панченко – ул. Сухаревская во Фрунзенском административном районе г. Минска. Планировочными ограничениями участка являются: с севера и юга – существующая жилая застройка, с востока – территория школы № 23 и существующая жилая застройка; с запада – улица Пимена Панченко.

Проектом предусматривается возведение многоквартирного жилого дома № 57 по генплану в микрорайоне Сухарево-5 города Минска. Объемно-планировочное решение здания разработано в изделиях индустриальной серии М464-М.

Жилой дом запроектирован двухсекционным, 7, 8-этажным; с техническим подпольем и теплым чердаком. Часть кровли в каждой секции – плоская рулонная с организованным внутренним водостоком; возвышающаяся над плоской кровлей часть – скатная из трехслойных кровельных сэндвич-панелей по металлической стропильной системе с наружными неорганизованным водоотводом на плоскую кровлю.

Наружные стены приняты из трехслойных железобетонных панелей толщиной 350 мм; стены внутренние – сборные панели из тяжелого бетона толщиной 160 мм. Перегородки межквартирные – сдвоенные из двух рядов блоков ячеистого бетона толщиной 100 мм каждый с заполнением пространства между ними минераловатными плитами, внутриквартирные – из блоков ячеистого бетона толщиной 100 мм.

Перекрытия междуэтажные – из сборных железобетонных плит толщиной 160 мм.

Высота этажей – 2,8 м от пола до пола; техподполья – 2,3 м от пола до пола; технического этажа – 1,2 м с переменной высотой.

Техподполье с отдельными наружными входами предназначено для прокладки инженерных коммуникаций и размещения технических помещений (индивидуального теплового пункта, водомерного узла).

На первом этаже жилого дома расположены помещения входных групп в секции жилого дома, жилые квартиры. В уровне первого этажа восьмиэтажной секции запроектирована электрощитовая с отдельным выходом непосредственно наружу; помещение товарищества собственников (ПТС). ПТС обеспечено отдельным входом и санузлом для маломобильных групп населения. Вход оборудован пандусом. В каждой секции размещена кладовая уборочного инвентаря.

Входные группы секций представлены крыльцом со ступенями и площадкой. Для физически ослабленных лиц на крыльце устанавливается подъемная платформа вертикального перемещения. Вход в жилую часть каждой секции осуществляется через тепловой тамбур.

На остальных этажах здания запроектированы жилые квартиры. В жилом доме размещено 59 квартир (однокомнатных – 14, двухкомнатных – 32, трехкомнатных – 13). Состав квартир: прихожие, коридоры, жилые комнаты, кухни, санитарные узлы.

Во всех квартирах предусмотрены остекленные летние помещения (лоджии).

Для эвакуации людей в жилом доме в каждой секции запроектирована лестничная клетка 1-го типа Л1. Вторые эвакуационные выходы в квартирах предусмотрены на лоджии с глухим простенком шириной 1,2 м. Вход на чердак и кровлю организован с лестничной клетки.

В каждой секции устанавливается лифт.

В жилом доме предусмотрено устройство окон с пониженной подоконной зоной и дополнительным устройством металлических ограждений с наружной стороны. Остекленные на всю высоту этажа лоджии выполняются с дополнительным устройством металлических ограждений с внутренней стороны.

Остекление лоджий выполняется из ПВХ профилей с заполнением однокамерным стеклопакетом, с поворотно-откидной системой открывания одной из створок.

Окна и балконные двери приняты из ПВХ профилей со стеклопакетом и поворотно-откидным механизмом.

Двери входные металлические, внутренние – деревянные.

Внутренняя отделка:

- помещения общего пользования:

Стены – покраска защитно-декоративным полимерным составом (ЗДПС), масляная покраска, акриловая покраска;

Потолки – ЗДПС, масляная покраска, акриловая покраска,

Покрытия полов – керамическая плитка, бетон мозаичного состава;

- Помещения квартир:

жилые комнаты, коридоры и кухни:

- потолки – акриловая покраска;

- стены – оклейка обоями;

Покрытие полов – линолеум на теплоизолирующей основе на клею;

Санузлы, уборные и ванные:

- потолки – покраска акриловая влагостойкая,

- стены – облицовка плиткой (совмещенные санузлы, ванные); оклейка обоями (уборные);

- покрытие полов – керамическая плитка.

Устройство зашивок инженерных коммуникаций в местах общего пользования и в квартирах – из гипсокартона по металлическому каркасу.

Наружная отделка:

Проектом предусмотрена окраска фасадов красками фасадными с повышенной цветоустойчивостью. Поверхность цоколя – фактурное покрытие защитно-декоративным составом.

Козырьки основных входов выполнены с покрытием из профнастила с полимерным покрытием.

В состав общего имущества по объекту входят: лестничные клетки, лестницы, лифт, лифтовые и иные шахты, коридор, крыша, чердак и подвалы, другие места общего пользования, несущие ограждающие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование общедомового назначения, находящиеся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы инженерной инфраструктуры, озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

В соответствии с решением Мингорисполкома от 24.09.2020 № 3146 «О предоставлении земельных участков и разрешении строительства» строительство 100 процентов жилых помещений в составе объекта осуществляется для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций.

**3. Для привлечения дольщиков к строительству по договорам создания объектов долевого строительства для граждан, в первую очередь многодетных семей, состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий в администрациях районов г. Минска, по направлениям соответствующих администраций предлагается 59 жилых помещений, в том числе:**

- 14 (четырнадцать) однокомнатных квартир общей площадью от 48,98 до 55,92 м²,

- 32 (тридцать две) двухкомнатные квартиры общей площадью от 65,73 до 80,15 м²,

- 13 (тринадцать) трехкомнатных квартир общей площадью 92,15 м².

**4. Стоимость строительства** 1 м² жилых помещений составляет:

- для нормативной площади – 1 935,68 рубля (одна тысяча девятьсот тридцать пять рублей 68 копеек).

- для площади, превышающей нормативную – 2 700,0 рубля (две тысячи семьсот рублей 0 копеек).

**Стоимость квадратного метра сформирована без учета затрат застройщика, не включенных в сводный сметный расчет стоимости строительства объекта долевого строительства, но относимых на стоимость строительства. Данные затраты будут предъявлены дольщику по окончанию строительства с заключением дополнительного соглашения.**

**5. Условия оплаты** – первоначальный взнос в размере 20 % стоимости строительства объекта вносится в течение 15 (пятнадцати) календарных дней с момента регистрации договора создания объекта долевого строительства в Мингорисполкоме, оставшаяся сумма оплачивается ежемесячно **в соответствии с графиком платежей, являющимся приложением к договору.**

**6. При подаче заявления и заключении договора с гражданином, в первую очередь из категории многодетных семей, состоящим на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий, по направлениям администраций районов необходимо личное присутствие лица, с которым будет заключаться договор с предоставлением:**

- паспорта (+ копии паспорта);

- направления администрации района г. Минска на долевое строительство,

- справки о состоянии на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий,

- документа, подтверждающего статус многодетной семьи (при наличии).

Документы для заключения договоров будут приниматься с **25 ноября 2020 года по адресу: г. Минск, ул. Гвардейская, 7.**

Если гражданин либо иной претендент на участие в долевом строительстве в течение 5 (пяти) календарных дней с момента регистрации его заявления не явился для заключения договора и не сообщил об уважительных причинах своей неявки, его заявление на участие в долевом строительстве считается не поданным, и застройщик оставляет за собой право заключить договор на заявленное помещение с другим претендентом.

Ознакомиться с информацией об объекте долевого строительства и ходе работ по строительству можно по адресу: **г. Минск, ул. Гвардейская, д. 7, каб. 111, тел.: (017) 251-07-26, +375 29 311 15 15.**



Нефармат

# Трэці раз замужам

**Калі адзін знаёмы калега аформіў шлюб трэці раз, у размовах ён любіў праводзіць розныя аналогіі і цытаваць вядомых людзей. Маўляў, што Дастаеўскі быў тры разы жанаты, і амаль вывеў тэорыю, нібыта трэці шлюб бывае самы ўдалы. Дыпламатычны Кабзон наогул любіў выказацца прыгожа, ну і пры гэтым, з сэнсам. Вядомае яго: «Я тры разы быў жанаты і кожны раз шчаслівы». Відаць, гэта і праўда, не так рэдка здараецца з мужчынамі.**

А вось калі жанчына, не спявачка, не актрыса, не паспяховая бізнес-лэдзі, а звычайная працаўніца тры разы выходзіць замуж, такое, бывае, і насцярожвае. Асабліва тых, хто лепей за ўсіх ведае, гатовы ўсіх асуджаць і ўсім ярлыкі вешаць. Выходзіць, не варта на іх зважаць, наогул грамадская думка — не лепшы дарадца, асабліва ў такіх пытаннях. Пра гэта не так даўно гаварылі з цікавай жанчынай, якую давялося сустрэць у адной з маіх экспедыцый па маленькіх вёсках. Яна, яшчэ даволі маладая, мілавідная жанчына, стараста вёскі, працаўніца, якіх пашукаць.

Аб чым шкадуе ў жыцці, дык толькі аб тым, што адукацыю добрую ў свой час не атрымала. Так склалася, што Людміла маці адна гадавала. Зусім нядрэнна вучылася, але паступаць у ВНУ нават не стала, бо пабаялася ехаць у сталіцу, каб не выглядаць белай варонай. Яе аднакласнікі, дзеці калгасных спецыялістаў ды і проста больш забяспечаных бацькоў, у 90-я гады мелі модныя джынсы-курткі, грошы на кішэнныя расходы. А яна прасіць у маці не пасмела б, бачыла, як тая жыве, ды і пайшла на работу пасля школы, добра, за некалькі кіламетраў была птушкафабрыка. Ну, а там хутка закахалася ў маладога майстра, замуж выскочыла зусім маладая. Сын нарадзіўся, жылі здаецца, і нядрэнна, але ж муж любіў выпіваць. І гэтыя яго вечныя паляванні-рыбалкі з сябрамі, з якіх яго прывозілі амаль у «непад'ёмным» стане, спачатку цярпела. Потым стала сварыцца, яго бацькам скардзіцца. Нічога не дапамагала. Цвярозы, ён прасіў прабачэння, абяцаў выправіцца, больш ніколі ў рот не браць. «Ніколі» канчалася ў наступныя выхадныя, калі навязлівыя сябрукі зноў падбухторвалі на выезд. І невядома, як было б далей, але аднойчы такі вось выезд скончыўся трагедыяй. Той, што быў за рулём, таксама нецвярозы, зусім амаль не пацярпеў, а ён адразу — насмерць. Так засталася ўдавою.

Яе, стараннную гаспадыню, руплівіцу на рабоце, праз колькі гадоў прыкмеціў чалавек з суседняй вёскі. Таксама як быццам працавіты: усё ў дом. Працаваў у калгасе кіроўцам, прыязджаў у сваты некалькі разоў, маляваў перспектывы сумеснага жыцця, вялікі дом абяцаў пабудаваць. Яна неяк усё раздумвала, нібы чаго пабойвалася. Але ўся вясковая грамада ў адзін голас раіла: не марудзь, дзеўка, не лаві варон, такія на дарозе не валяюцца. Ну і згадзілася. Справілі вяселле, сціплае, для самых блізкіх. Праз некаторы час дачушка нарадзілася. Дом, як і абяцаў, пабудаваў. А яна ўжо старалася, каб было і чыста, і прыгожа, і нагатавана, і напрасавана. Але муж часцей быў незадаволены, усё прыдзіраўся па дробязях. А калі здаралася выпіць, стаў руку падымаць. Далей — болей. Стала падумваць пра развод, дома шкада было, столькі ўкладзена душы і працы. Але ж калі зрабілася зусім невыносна, прыняла рашэнне. Праўда, да гэтага столькі было выплакана і выпакутавана. «Ніколі не думала, што так можа быць у жыцці, раней толькі чытала пра хатні гвалт, — расказвае Люда. — А тут бывала, спаць клалася ў куртцы, каб хутчэй выбягаць, калі холадна на вуліцы». Ну і адважылася. Сышла раз і назаўсёды. Узяла крэдыт на рэканструкцыю старой хаты, яшчэ бабулінай. Сын падрос, ужо вучыўся ў каледжы. З дачкой ягады-грыбы летам збіралі, каб яе ў школу адправіць. Неяк выкручваліся.

З Васілём пазнаёмілася выпадкова, у паліклініцы. Стаў заязджаць. Тут ужо вясковая грамада выказала рашучую непрыязнь. Ну як жа, яна такая станоўчая, нацярпелася ў сваім жыцці, а ён сядзеў у турме. На жаль, было такое ў яго біяграфіі. Трапіў па маладосці ў непрыемную гісторыю. Але ж яна ўжо не юная, каб у людзях не разбірацца. Ён расказаў, як яго падставілі, як сутыкнуўшыся з людской подласцю, разгубіўся і па сутнасці адседзеў за чужое злачынства. І яна верыла. Але думала, сумнявалася. На святы ён часам дарыў прыгожыя глянцавыя часопісы. У адным з іх прачытала інтэрв'ю з Ірынай Хакамадай. Тая гаварыла, што не вельмі верыць сацыёлагам, якія сцвярджаюць, што людзі зараз не хочуць жаніцца, выходзіць замуж. Проста яны не знайшлі пакуль свайго чалавека — сцвярджала медыйная персона. «Вось гэта і стала тады вырашальным, я згадзілася. Зараз нарэшце адчула душэўны спакой, якога раней не мела. Дадому іду з ахвотай. Што можа быць лепшым за гэта?» — казала мая суразмоўніца.

І праўда, сустрэць свайго чалавека вялікае шчасце, не кожнаму выпадае. І хоць жыве яна цяпер не ў прасторным доме, а ў невялікай утульнай бабулінай хаце, ружы ў яе на падворку ў лістападзе цвітуць. Іншыя ўжо даўно зрэзалі ссохлыя бутоны, укарацілі галінкі, укрылі кусты апалым лісцем да вясны. А ў яе каля ганка распусціліся жоўта-аранжавыя шыкоўныя кветкі і раскошна блішчаць пад цяжкімі кроплямі расы. Даглядаць умее ці сарты ведае?

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| **Мінск —** | 8.45 | 17.04 | 8.19 |
| **Віцебск —** | 8.40 | 16.48 | 8.08 |
| **Магілёў —** | 8.35 | 16.54 | 8.19 |
| **Гомель —** | 8.25 | 16.58 | 8.33 |
| **Гродна —** | 8.59 | 17.21 | 8.22 |
| **Брэст —** | 8.53 | 17.28 | 8.35 |

## Месяц

*Маладзік 15 лістапада.*
*Месяц у сузор'і Вадаліва.*

## Імяніны

***Пр.** Аляксандры, Ніны, Мікалая, Паўла.*
***К.** Альжбеты, Саламеі, Іпаліта, Максіма, Паўла, Севярына.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

# ЗАЎТРА




Даты | Падзеі | Людзі

**19 ЛІСТАПАДА**

У краіне

**1900** год — нарадзіўся Міхаіл Васілевіч Дарашэвіч, беларускі дзяржаўны дзеяч, вучоны ў галіне геадэзіі, прафесар, заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі. З 1947-га быў рэктарам БПІ, затым міністрам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Беларусі. Аўтар навуковых прац па розных відах геадэзічных здымак, камеральнай апрацоўцы палявых матэрыялаў, выяўленні і вывучэнні тарфяных радовішчаў.



**1910** год — прыватная прагімназія Ільінскай рэарганізавана ў Бабруйскую жаночую прыватную гімназію.

**1915** год — нарадзіўся Вадзім Андрэевіч Жучкевіч, беларускі географ, доктар геаграфічных навук, прафесар, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі.

**1930** год — нарадзіўся Рэм Іванавіч Салаухін, вучоны ў галіне механікі і газадынамікі, акадэмік НАН Беларусі, член-карэспандэнт АН СССР і Міжнароднай акадэміі астранаўтыкі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар. Лаўрэат Ленінскай прэміі за даследаванне дэтанацыі ў газах.

**1990** год — заснаваны Магілёўскі абласны мастацкі музей.

У свеце

**1840** год — нарадзіўся Аляксандр Ануфрыевіч Кавалеўскі, расійскі біёлаг, адзін з заснавальнікаў параўнальнай эмбрыялогіі і фізіялогіі, акадэмік Пецярбургскай АН (1890). На працягу сарака гадоў вёў даследаванні багатага жывёльнага свету ў Міжземным, Адрыятычным, Чырвоным, Каспійскім морах. Працы Кавалеўскага ляглі ў аснову філагенетычнага кірунку ў эмбрыялогіі.



**1875** год — нарадзіўся Міхаіл Іванавіч Калінін, савецкі дзяржаўны і партыйны дзеяч, старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР у 1938—1945 гадах, Герой Сацыялістычнай Працы.

**1965** год — Генеральная Асамблея ААН па ініцыятыве СССР прыняла рэзалюцыю аб нераспаўсюджванні ядзернай зброі.

**2000** год — уступіла ў сілу канвенцыя аб забароне і неадкладных мерах па выкараненні найгоршых формаў дзіцячай працы, прынятая на 87-й сесіі Генеральнай канферэнцыі Міжнароднай арганізацыі працы ў чэрвені 1999-га.

Так гаварылі...

**ВІСАРЫЁН БЯЛІНСКІ:**

*«Добра быць вучоным, паэтам, ваяром, заканадаўцам і інш., але дрэнна пры гэтым не быць чалавекам».*

## УСМІХНЕМСЯ

**Пажылая пара. Жонка папракае мужа:**

**— Чаму ты больш не сочыш за сабой, не так добра апрануты, як тады, калі мы пажаніліся?**

**— А вось і не! Хіба ты не памятаеш гэтую кашулю? Я ж быў менавіта ў ёй на нашым першым спатканні!**

Святлана скардзіцца сяброўкам:

— Ніяк не магу прывучыць свайго Пятра да парадку — кожны раз ён кладзе бумажнік у новае месца!

**У Васілька пытаюцца:**

**— Чаму ў цябе сіняк пад вокам?**

**— А нняхай не лезуць!..**

Адзін часопіс для мужчын абвясціў конкурс на найлепшае апісанне сваёй раніцы.

Першае месца заняў аўтар такога твора: «Я ўстаю, снедаю, апранаюся і еду дадому».




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмная – 311 17 13 (тэл./факс);
аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 3519.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 лістапада 2020 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12